ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



## Чаму Віталь Варанко не стаў інжынерам?



## Замест водпуску — «на лагерныя работы»



## Лісабон вачыма будучага архітэктара

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЖНІЎНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 152 (27762) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# НА ПЕРШЫ СПАС МЁД СВЯЦІ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*Сёння да вадаёмаў, крыніц рушаць хрэсныя ходы, асвячаюць ваду. Раней у гэты дзень асвячалі новыя студні і прыбіралі старыя, купалі жывёлу, купаліся самі ў рацэ, каб змыць грахі і быць здаровымі.*

*У народным календары першы Спас пазначаны як Мядовік і Макоўе, свята пчаляроў. У першай палове жніўня ў вуллях заломвалі першыя мядовыя соты. Саладкім абавязкова частавалі дзяцей. Людзі верылі: калі бортнік пашкадуе мёду хоць аднаму дзіцяці, у яго знікнуць пчолы. У даўнейшыя часы лічылася, што менавіта з першага Спаса пчолы перастаюць рабіць мёд.*

■ Здароўе нацыі

# ШТО ЯДЗІМ? ЯК ВЫПІВАЕМ?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Адказы на самыя актуальныя пытанні, звязаныя з захаваннем здароўя органаў ад страваводу да кішэчніка, прапануе дацэнт 2-й кафедры ўнутраных захворванняў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук, урач-гастраэнтэролаг вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Мікалай КАПРАЛАЎ.**

**— Эзафагіт, гастрыт, панкрэатыт, гепатыт... Чалавек ведае шмат спосабаў нашкодзіць здароўю страўнікава-кішачнага тракту. Многія па-ранейшаму «гасяць» пякотку содай. Але такі сімптом можа ўказваць на сур'ёзнае захворванне. Як западозрыць яго надыход?**

— Хваробы верхняга аддзела страўнікава-кішачнага тракту — стрававода, страўніка і дванаццаціперснай кішкі — шырока распаўсюджаны сярод насельніцтва нашай краіны. Калі праблема лячэння язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі, можна сказаць, вырашана, колькасць такіх хворых знізілася, то колькасць пацыентаў з гастраэзафагеяльнай рэфлюкснай хваробай захоўваецца на ранейшым высокім узроўні. Да 20 працэнтаў дарослых пакутуюць ад гэтай паталогіі. Што ж такое ***рэфлюкс***? Гэта вяртанне, або закідванне змесціва страўніка ў стрававод, адкуль яно можа трапіць і ў ротавую поласць. Прычына ў тым, што сфінктар, які аддзяляе стрававод і страўнік, павінен знаходзіцца ў замкнёным стане і адкрывацца толькі тады, калі пасля прыёму ежы харчовая кашыца рухаецца па страваводзе ў страўнік. Аднак у некаторых людзей гэты сфінктар не замыкаецца як след. А значыць, ежа мае магчымасць «вяртацца».

Наогул пякотка бывае і ў здаровых людзей — пры празмерным ужыванні ежы, пераяданні. Сімптом працягваецца тады ўсяго некалькі хвілін.

СТАР. 4

■ Актуальна

# ЖКГ: перазагрузка

### У СФЕРЫ ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ ЧАКАЮЦЦА ПРЫНЦЫПОВЫЯ ЗМЕНЫ



**З 4 лютага па 31 мая створаная па даручэнні Прэзідэнта рабочая група па праблемных пытаннях у ЖКГ вывучыла ўсе аспекты функцыянавання жыллёва-камунальных арганізацый, станоўчы вопыт і адмоўныя тэндэнцыі, якія перашкаджаюць развіццю галіны. Было таксама разгледжана звыш 400 зваротаў грамадзян па камунальна-бытавых пытаннях, якія паступілі ў перыяд дзейнасці рабочай групы.**

**У выніку ўдзельнікамі рабочай групы быў распрацаваны праект Указа «Аб мерах па ўдасканаленні работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі Беларусі». Некаторыя прапановы, як мяркуецца, павінны прынцыпова змяніць функцыянаванне асобных галін ЖКГ.**

## Кіраўнікоў стане менш

Сёння, па словах **міністра ЖКГ Андрэя ШОРЦА,** у кожнай вобласці існуе свая структура кіравання жыллёва-камунальнай гаспадаркай. Так, у Віцебскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцях — гэта дзяржструктуры і ўпраўленні ў складзе аблвыканкамаў, а ў Брэсцкай, Гомельскай і Мінскай абласцях — камерцыйныя прадпрыемствы.

Такое становішча прыводзіць да неабгрунтаваных адрозненняў у зарплатах работнікаў і кіраўнікоў арганізацый ЖКГ у розных рэгіёнах рэспублікі.

СТАР. 3

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ЧАРАВАЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па заканадаўстве:**

***«Лічу, што вынесены на днях на абмеркаванне праект Закона «Аб карупцыі» дастаткова збалансаваны — па абмежаваннях, па чаканых наступствах для нячыстых на руку дзяржслужачых. У цэлым пытанняў па ім не ўзнікае. Іншая справа, што падчас грамадскага абмеркавання, разгляду дэпутатамі ў парламенце могуць уносіцца прапановы, карэкціроўкі па нейкіх артыкулах. Гэта дазволіць распрацаваць яшчэ больш гарманічны дакумент, які будзе працаваць на карысць».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.08.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10370,00 | ▲ |
| Еўра | 13840,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 286,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 800,77 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X
14152>
9 771990 763008

■ Блізкая ўлада

# ДЗЕ ЗНАЙСЦІ МЕСЦА МАШЫНЕ?

## МІНСК ТОЛЬКІ НА 40 ПРАЦЭНТАЎ ЗАБЯСПЕЧАНЫ ПАРКОЎКАМІ

**…Пры гэтым у сталіцы да канца гэтага года з'явяцца яшчэ 200 тысяч так званых машына-месцаў. Падобнай інфармацыяй падчас міністэрскай «прамой лініі» падзяліўся <u>намеснік міністра ўнутраных спраў, генерал-маёр Мікалай МЕЛЬЧАНКА.</u> Прапануем вашай увазе некаторыя адказы на пытанні.**

***— Мікалай Аляксандравіч, я жыву ў Мінску, на вуліцы Кальцова. У нас транспартам літаральна заставілі ўсе скверы, паркуюць машыны паўсюль, дзе толькі магчыма. Тэрыторыю так запаганілі, што становіцца страшна. Аднак правілы паркоўкі ў дварах яшчэ ніхто не скасаваў. Тады чаму такое бязладдзе?***

— Мінск усяго толькі на 40 працэнтаў забяспечаны паркоўкамі. Да канца гэтага года ў сталіцы павінны пабудаваць яшчэ 200 тысяч так званых машына-месцаў. А да 2020 года — 400 тысяч. Між іншым, за стану транспартнага сродку з парушэннем правілаў дарожнага руху прадугледжаны штраф. І супрацоўнікі ДАІ маюць права ў такім выпадку правесці прымусовую буксіроўку, калі вадзіцель не знаходзіцца ў машыне. Рашэннем Мінскага гарадскога і абласнога выканаўчых камітэтаў установлены фіксаваныя тарыфы на выкарыстанне, захаванне і прымусовую эвакуацыю гэтага транспарту. Па магчымасці, мы праводзім тлумачальныя размовы, каб жыхары захоўвалі свае аўто не на дваравой тэрыторыі, а на спецыяльна абсталяваных для гэтага стаянках. Безумоўна, яны платныя і не ўсе жадаюць там пакідаць свой транспарт. Таму работу па прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці ўсіх гэтых парушальнікаў мы праводзім пастаянна. Дарэчы, няправільную паркоўку хутка будзе выяўляць фотафіксатар. Магчыма, падобная акалічнасць таксама паспрыяе навядзенню парадку ў гарадскіх дварах.



***— Па праспекце Незалежнасці пастаянна ноччу ганяюць матацыклісты. Яны спаць не даюць, плююць на правілы дарожнага руху, на папярэджанні. Трэба ж нешта зрабіць, каб спыніць гэтае нахабства!***

— Мы абавязкова праверым, хто так актыўна ездзіць па начах па праспекце. А наогул усе прапановы па ўпарадкаванні руху гэтых гора-матацыклістаў знаходзяцца на разглядзе ў Савеце Міністраў. Праца ў гэтым кірунку сапраўды вядзецца. Увогуле за апошнія сем месяцаў ужо складзена 2908 адміністрацыйных пратаколаў, якія датычацца матацыклістаў. За кіраванне матацыклам у нецвярозым стане затрыманы 723 іх уладальнікі, з якіх 53 чалавекі — паўторна. А вось за перавышэнне хуткасці супрацоўнікі ДАІ спынілі 608 матацыклістаў.

***— Тэлефаную вам з Дзяржынска. Ужо даўно хачу разам з жонкай абсталяваць кватэру ахоўнай сігналізацыяй. Падкажыце, ці змяніліся тарыфы?***

— Штомесячны кошт аховы кватэр у жылых дамах, а таксама кожнага ўзроўню дома, кватэры, катэджа складае 50 тысяч рублёў. Для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і інвалідаў баявых дзеянняў, былых вязняў канцэнтрацыйных лагераў кошт складае 1,5 тысячы рублёў. Тарыфы са зніжкамі таксама прадастаўляюцца грамадзянам, з якімі пражываюць тыя, хто мае права на льготную аплату. Зразумела, што ўсталяванне апаратуры на першых і апошніх паверхах жылых дамоў будзе каштаваць даражэй, бо неабходна будзе падключыць больш датчыкаў. Поўная блакіроўка аднапакаёвай кватэры на першым паверсе абыдзецца ў 3,1 млн рублёў, двухпакаёўкі — у 3,9 млн рублёў, а трохпакаёвай кватэры — у 4,7 млн. За блакіроўку аднапакаёвай кватэры на другіх паверхах прыйдзецца аддаць 2,5 млн рублёў.

***— Калі верыць сіноптыкам, спякотнае надвор'е ад нас сыходзіць. І ўсё менш людзей будуць адпачываць каля вадаёмаў. Хто ведае, можа, гэта і добра, бо па тэлебачанні часта кажуць пра няшчасныя выпадкі на вадзе. Ці ёсць у вас адмысловая статыстыка падобных здарэнняў?***

— На маю думку, людзі актыўна адпачываць каля вады будуць яшчэ да сярэдзіны верасня. Дажджы пачаліся, але высокая тэмпература яшчэ застаецца. І анамальныя яе праяўленні, безумоўна, уплываюць негатыўна. На вадзе сёлета загінула ўжо больш за 400 чалавек. На жаль, шмат гіне дзяцей, бацькі якіх не здолелі стварыць нармальныя ўмовы для іх адпачынку.

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара** ■

■ На палях

# МОЖАМ НАМАЛАЦІЦЬ БОЛЬШ ЗА 9 МІЛЬЁНАЎ ТОН

**Беларускія аграрыі працягваюць уборачную кампанію. Ужо прыбрана 92,7% плошчаў збожжавых і зернебабовых культур. А мільённага намалоту дасягнула і Віцебская вобласць.**

У гэтым рэгіёне, па апошніх звестках Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, сабралі амаль 1,07 млн тон збожжа. Астатнія вобласці паказваюць яшчэ больш высокія вынікі — ад 1,29 да 2,112 млн тон. Усяго па краіне сабрана ўжо амаль 8,885 млн тон збожжа, што дае падставы для прагнозу на ўраджай, большы за 9 мільёнаў тон. Аб гэтым ужо могуць заяўляць нават самыя прымхлівыя аграрыі.

Сярэдняя ўраджайнасць па краіне па-ранейшаму застаецца высокай — 39,5 ц/га (на 6,2 цэнтнера больш чым летась).

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**




■ Акцыя

## МІНПРАЦЫ ПРЫЕДЗЕ Ў НАВАГРУДАК

**Заўтра ў Навагрудку пройдзе чарговы этап акцыі «Дзень з Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны».**

Праграма акцыі ўключае сустрэчы з працоўнымі калектывамі і жыхарамі рэгіёна, асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб кіраўніцтвам міністэрства, кансультацыі, «круглыя сталы» і тэматычныя прамыя тэлефонныя лініі, працу электроннай прыёмнай.

У рамках акцыі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Ігар Старавойтаў сустрэнецца з актывам раёна, правядзе асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб у Навагрудскім райвыканкаме, наведае аддзяленне кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і аддзяленне дзённага знаходжання інвалідаў ТЦСАН Навагрудскага раёна і Навагрудскі завод газавай апаратуры.

Жыхары Навагрудскага раёна змогуць атрымаць кансультацыі спецыялістаў міністэрства як на прыёме ва ўпраўленні па працы, занятасці і сацабароне Навагрудскага райвыканкама, так і праз інтэрнэт.

■ Грошы

## Яшчэ раз пра тарыфы

**У мінулым нумары мы напісалі, што з 1 верасня некаторыя тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі будуць праіндэксаваны на 9,8%. У рэдакцыю пазваніў тэлефонны званок, у якім наш чытач з Барысава папрасіў удакладніць, якія менавіта паслуг гэта датычыцца.**

Будуць праіндэксаваны толькі тарыфы, якія субсідуюцца дзяржавай, гэта значыць, тыя, якія не дасягнулі 100-працэнтнага ўзроўню кампенсацыі выдаткаў з боку насельніцтва. Да іх адносяцца тарыфы на тэхнічнае абслугоўванне жылога дома, на халоднае водазабеспячэнне і каналізацыю, на электраэнергію, газ, капрамонт і тарыфы на карыстанне ліфтам. А, напрыклад, тарыфы па вывазе смецця ў асобных рэгіёнах, дзе яны 100-працэнтна аплачваюцца насельніцтвам, не будуць падлягаць індэксацыі.

Яшчэ раз нагадваем, што індэксацыя тарыфаў звязана з ростам сярэдняй зарплаты па краіне ў другім квартале.

## Перакрыжаванага субсідавання ў ЖКГ не будзе

**Мы плануем цалкам ліквідаваць перакрыжаванае субсідаванне да 2017 года, заявіў журналістам міністр ЖКГ Андрэй ШОРАЦ.**

Гэта азначае, што тарыфы для прадпрыемстваў, якія цяпер плацяць за сябе і часткова за насельніцтва, будуць зніжацца, а для насельніцтва, такім чынам, паступова павялічвацца да рэальнага сабекошту.

— Сёлета такі эксперымент праводзіцца ў Брэсцкай вобласці, — сказаў Андрэй Шорац, — і мы бачым, што гэта дае станоўчыя вынікі. Ліквідацыя перакрыжаванага субсідавання прывядзе да зніжэння нагрузкі на рэальны сектар эканомікі. Ужо ў наступным годзе плануецца знізіць перакрыжаванае субсідаванне з 11% да 7%, г. зн. на 4 працэнтныя пункты.

**Святлана БУСЬКО.**

## Не болей за 35,2%

### Малому бізнесу стане лягчэй?

**З сённяшняга дня айчынныя банкі не могуць выдаваць юрыдычным асобам крэдыты ў беларускіх рублях па стаўцы, вышэйшай за 35,2% гадавых, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.**

Нагадаем, што з 15 ліпеня ў дачыненні да ставак па крэдытах для юрыдычных асоб дзейнічала абмежаванне — не вышэй за 36,6% гадавых. У ліпені памер сярэдняй працэнтнай стаўкі па новых крэдытах, якія даюць банкі юрыдычным асобам у беларускіх рублях (без уліку крэдытаў, якія прадастаўляюцца на льготных умовах), склаў 35,2% гадавых. «У адпаведнасці з пастановай праўлення Нацыянальнага банка ад 22 красавіка № 260, гэты паказчык выкарыстоўваецца для вызначэння максімальнага памеру працэнтных ставак па аперацыях банкаў па прадастаўленні грашовых сродкаў (крэдытаў) юрыдычным асобам — рэзідэнтам Беларусі ў беларускіх рублях з 14 жніўня», — гавораць у Нацбанку.

Рашэнне абмежаваць максімальны памер працэнтных ставак па банкаўскіх крэдытах у беларускіх рублях для юрыдычных асоб — рэзідэнтаў Беларусі было прынята для павышэння даступнасці крэдытных рэсурсаў для рэальнага сектара эканомікі краіны, у тым ліку суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Пастанова праўлення Нацыянальнага банка № 260 будзе дзейнічаць да 1 студзеня 2015 года.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

25 августа 2014 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.

Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 18.08.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200295903

Совет директоров.

## Памятны знак Чавесу адкрыюць у верасні

**Памятны знак Уга Чавесу адкрыюць у Мінску ў верасні, паведаміў БЕЛТА галоўны інжынер прадпрыемства «Спецпаркбуд» Дзмітрый Русін.**

Яго адкрыюць у парку імя венесуэльскага лідара, які размешчаны ў мікрараёне Каменная Горка ў межах вуліц Казіміраўскай, Калеснікава, Лідскай і Каменнагорскай. Паводле слоў Дзмітрыя Русіна, работы па стварэнні кампазіцыі завершацца ўжо на бягучым тыдні.

**ИЗВЕЩЕНИЕ**
**о проведении повторных аукционных торгов по продаже имущества, обращенного в доход государства**

| № лота | 1 |
|---|---|
| Наименование объекта | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-69179 площадью 1043,6 кв.м (торговое помещение на 4-м этаже капитального строения с инвентарным номером 100/С-2354 на земельном участке с кадастровым номером 140100000001008926 площадью 0,2998 га). *Характеристика: материал – кирпич, ж/б панели, 1975 год постройки, стены кирпичные, перегородки – гипсокартон, перекртия ж/б, полы плиточные, окна и двери – ПВХ стеклопакеты, филенчатые, отопление центральное, электроснабжение – скрытая электропроводка, водопровод и канализация есть, износ 12%.* |
| Местонахождение объекта | г. Брест, ул. Московская, 202 |
| Начальная цена продажи с НДС, руб. | 10 351 083 600<br>начальная цена снижена на 10% |
| Сумма задатка, руб. | 1 035 100 000 |

**Организатор аукционных торгов –**
**<u>КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»</u>**

**ПРИМЕЧАНИЕ:** Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Указом Президента РБ от 04.09.2006 №559.

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и подписать соглашение о правах и обязанностях сторон при организации и проведении аукциона с КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью».

**При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, предоставляет:**

• копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
• документ, подтверждающий полномочия представителя юридического лица, и его паспорт;
• паспорт для физических лиц или их представителей, нотариально заверенная доверенность для представителя физического лица;
• заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающие внесение задатка в размере 10% от начальной цены объекта;
• организациями – нерезидентами Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе);
• организациями и физическим лицами – нерезидентами Республики Беларусь – документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на бел. (рус.) язык;
• представителями организаций и физических лиц – нерезидентов Республики Беларусь – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

<u>Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:</u>

• **в течение 3 рабочих дней** с даты проведения торгов оплатить сумму в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.
• в течение 2 месяцев и 25 дней с даты проведения торгов и подписания протокола о результатах аукциона осуществить оплату за предмет аукциона. Право собственности на приобретенный на аукционе объект недвижимости, обращенный в доход государства, регистрируется в соответствии с законодательством.

**Победителю аукциона для обслуживания приобретенного объекта отвод земельного участка будет осуществлен в установленном законодательством порядке**.

**Аукцион состоится <u>18 сентября 2014 г.</u> в 11.00**
**по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 14.08.2014 г. до 17.30 12.09.2014 г.**
**по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53-81-92, 53-45-65.**
**Сайт: bgcn.by, city.brest.by**

# ЖКГ: перазагрузка

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры гэтым у асобных аб'яднаннях назіраецца залішняя колькасць кіруючых пасад.

У будучым, па словах Андрэя Шорца, прапануецца функцыі дзяржаўнага рэгулявання ў гэтай сферы ўскласці на ўпраўленні ЖКГ у складзе аблвыканкамаў, а функцыі галіновага кіравання дзяржарганізацыямі ЖКГ — на дзяржустановы, якія будуць створаны пры аблвыканкамах. Гэта, па словах міністра, павінна прывесці да паляпшэння вынікаў працы сістэмы ЖКГ у цэлым, а таксама павысіць якасць паслуг.

Плануецца, што заказчыкамі па праектаванні капрамонту, рэканструкцыі і мадэрнізацыі жылых дамоў стануць адпаведныя камунальныя ўнітарныя прадпрыемствы.

У раённых цэнтрах ёсць упраўленні капітальнага будаўніцтва (УКБ) райвыканкама і камунальныя прадпрыемствы, і гэтыя дзве структуры дублююць адна адну. Перадача функцый прафесійнай арганізацыі дазволіць знізіць выдаткі і павысіць якасць капітальнага рамонту, лічыць міністр ЖКГ.

## Скараціць выдаткі на аказанне паслуг

Каб кіраўнікі і работнікі жыллёва-эксплуатацыйных арганізацый не выконвалі не ўласцівых ім задач, прадугледжваецца заканадаўча ўстанавіць, што дзейнасць арганізацый ЖКГ, не звязаная з аказаннем жыллёва-камунальных паслуг, будзе ажыццяўляцца на платнай аснове. Гэта адносіцца, напрыклад, да кантролю за мэтавым выкарыстаннем зямельных участкаў, прадухілення доступу ў неэксплуатаваныя будынкі і г.д.

Акрамя таго, будзе спынена практыка ўтрымання ў сістэме ЖКГ няпрофільных аб'ектаў. Як заявіў міністр ЖКГ, дагэтуль на баланс арганізацый ЖКГ перадаваліся ваенныя гарадкі, будынкі камісарыятаў, іншыя аб'екты сацыяльна-культурнай і вытворчай сферы, якія знаходзяцца ў аварыйным стане. Іх утрыманне ўваходзіла ў затраты галіны. Андрэй Шорац лічыць, што абслугоўванне такой маёмасці павінна рабіцца на дагаворных адносінах і кампенсавацца са сродкаў адпаведных бюджэтаў.

Каб ліквідаваць пасрэднікаў пры прадастаўленні жылкампаслуг, Міністэрствам ЖКГ сумесна з Мінэнерга выпрацаваны агульныя падыходы да перадачы цеплавых сетак (якія знаходзяцца на балансе арганізацый ЖКГ і па якіх ідзе транспарціроўка спажыўцам цеплавой энергіі для ацяплення і гарачага водазабеспячэння) у веданне ўладальнікаў цеплакрыніц — арганізацый «Белэнерга».

## У нас з'явяцца хаус-майстры

Каб палепшыць якасць паслуг, плануецца, што ў бліжэйшай перспектыве ўвесь жыллёвы фонд будуць абслугоўваць так званыя хаус-майстры — спецыялісты па комплексным абслугоўванні і эксплуатацыі шматкватэрных жылых дамоў, якія выконваюць працу электрыка, слесара-сантэхніка, маляра, цесляра.

За кошт скарачэння колькасці работнікаў заработная плата хаус-майстра ўзрасце ў 1,5 раза. Гэта раней паказаў вопыт Мінска: зарплата сталічных хаус-майстроў узрасла да 7,5 млн рублёў. Зараз у цэлым па краіне падрыхтавана 1,6 тыс. такіх майстроў, з іх 66% — у Мінску. Як заявіў Андрэй Шорац, гэтыя людзі трымаюцца за сваю працу, шануюць яе. Цякучасць кадраў спынілася. Жыхары ведаюць майстроў і звяртаюцца да іх. «Хаус-майстар зацікаўлены, каб выканаць працу якасна, бо ў адваротным выпадку перарабляць яе прыйдзецца самому», — сказаў міністр.

Дарэчы, мерапрыемствы па аптымізацыі структуры і колькасці ўжо праводзяцца ў арганізацыях галіны. Па выніках першага паўгоддзя, колькасць работнікаў сістэмы ЖКГ скарочана на 1260 чалавек. У бліжэйшы час толькі ў Мінску падлягае скарачэнню больш за 500 штатных адзінак апарату кіравання, што дазволіць сэканоміць фонд заработнай платы ў памеры звыш 43 млрд рублёў у год.

## Грошы на капрамонт — у агульны «кацёл»

Усе арганізацыі, якія абслугоўваюць жыллёвы фонд, незалежна ад формы ўласнасці, будуць уносіць плату за капрамонт на субрахунак мясцовых органаў улады.

**Увесь жыллёвы фонд будуць абслугоўваць так званыя хаус-майстры — спецыялісты па комплексным абслугоўванні і эксплуатацыі шматкватэрных жылых дамоў, якія выконваюць працу электрыка, слесара-сантэхніка, маляра, цесляра.**

Як паведаміў журналістам міністр ЖКГ, гэта ў большай ступені тычыцца жыллёвых кааператываў і таварыстваў уласнікаў, якія назапашваюць грошы на сваіх рахунках, і яны з часам губляюць сваю каштоўнасць з-за інфляцыйных працэсаў, ці накіроўваюцца на іншыя мэты. «А калі прыходзіць час правядзення капрамонту, яны звяртаюцца ў выканкам з просьбай правесці ў іх гэтыя работы», — адзначыў Андрэй Шорац.

Такім чынам, гэтыя сродкі будуць налічвацца па прынцыпе «агульнага катла». Насамрэч гэты прынцып у нашай рэспубліцы ўжо дзейнічае. Зараз усе дамы, якія абслугоўваюцца прадпрыемствамі ЖКГ, адлічваюць грошы на рахункі мясцовых выканаўчых органаў. І гэта найбольш аптымальны варыянт для нашай краіны, перакананы міністр. Ён адзначыў, што Расія таксама пайшла па гэтым шляху.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Таксама ўнесена прапанова, каб разлікі па ўліку, разліку і налічэнні аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі і карыстанне жылымі памяшканнямі ажыццяўляліся арганізацыямі, упаўнаважанымі мясцовымі выканкамамі. Гэта неабходна для таго, каб не дапусціць прад'яўлення грамадзянам неабгрунтаваных плацяжоў і каб кожны ЖБВК або таварыства ўласнікаў (ТУ) не ўтрымлівалі для гэтых мэт уласную структуру.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за працай галін сферы матэрыяльнай вытворчасці Камітэта дзяржкантролю Сяргей РАЎНЕЙКА** лічыць, што гэта не значыць, што ажыццяўляць разлікі можа толькі разлікова-даведачны цэнтр. «Калі службы ТУ адпавядаюць усім патрабаванням і даводзяць неабходную інфармацыю да насельніцтва ў поўным аб'ёме і пры гэтым не ўзнікае ніякіх канфліктных пытанняў, то яны маюць права прэтэндаваць на званне такой упаўнаважанай арганізацыі», — сцвярджае ён.

## Павышэнне фінансавай і плацежнай дысцыпліны

Каб арганізацыі ЖКГ не мелі патрэбы ў прыцягненні крэдытаў для ажыццяўлення бягучай дзейнасці, рабочая група прапануе абавязаць пералічваць субсідыі па аказаных насельніцтву паслугах для арганізацый ЖКГ з мясцовых бюджэтаў штомесяц на працягу 10 рабочых дзён з дня прыняцця плацежных дакументаў на пералік гэтых субсідый.

Таксама прапануецца ў законе аб рэспубліканскім бюджэце на чарговы фінансавы год абавязкова вызначаць мінімальныя нарматывы бюджэтнай забяспечанасці расходаў на фінансаванне мерапрыемстваў па капрамонце жылля, трубаправодаў цеплазабеспячэння, сетак водазабеспячэння і каналізацыі. Гэта дасць магчымасць не дапусціць скарачэння запланаваных гадавых аб'ёмаў фінансавання расходаў на гэтыя мэты.

## За парушэнні — дадатковая адказнасць

Прапануецца ўстанавіць адміністрацыйную адказнасць за невыкананне сацыяльных стандартаў у галіне ЖКГ; за ўнясенне ў плацежны дакумент на аплату жыллёва-камунальных паслуг неабгрунтаваных плацяжоў; за правапарушэнні, якія дапускаюцца старшынёй праўлення таварыства ўласнікаў пры выкананні ім сваіх функцый; за парушэнне заканадаўства аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг; за парушэнне спакою грамадзян у начны час і інш.

**P. S.** ***У бліжэйшы час пытанні павышэння эфектыўнасці дзейнасці арганізацый ЖКГ будуць абмяркоўвацца на пасяджэнні ўрада.***

**Святлана БУСЬКО.**

## Извещение о проведении аукционных торгов по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Бресте

| № лота | Адрес участка/ кадастровый номер | Кадастровый номер 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Срок аренды, лет | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Карьерная | 1028438 | 0,2800 | строительство и обслуживание объекта производственно-офисного, бытового назначения | 10 | **121 727 232** | 24 300 000 | **8 447 772** | ограничений в использовании земель нет |
| 2 | ул. Шоссейная | 1028439 | 0,3601 | строительство и обслуживание складских помещений | 10 | **118 835 272** | 23 760 000 | **9 501 428** | ограничений в использовании земель нет |
| 3 | в районе ул. Ковельской, 85 | 1027194 | 0,0096 | строительство и обслуживание магазина продовольственной группы товаров | 10 | **7 159 493** | 1 430 000 | **450 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 4 | ул. Рябиновая (№32 по ГП) | 1028116 | 0,1116 | строительство и обслуживание продовольственного магазина | 10 | **137 578 493** | 27 510 000 | - | 0,0232 га – охранная зона линии связи; 0,0512 га – охранная зона сетей канализации |
| 5* | ул. Писателя Смирнова | 1028423 | 1,0909 | строительство и обслуживание торгового объекта | 10 | **547 936 948** | 109 580 000 | **15 206 021** | 0,0597 га – охранная зона сетей и сооружений газоснабжения |
| 6* | № 57 (по ГП) согласно ПДП «ЮЗМР-2» | 1028426 | 0,3869 | строительство и обслуживание объекта торговли | 10 | **382 752 963** | 76 550 000 | **7 855 752** | ограничений в использовании земель нет |
| 7* | ул. 2-я Белорусская | 1019335 | 0,8704 | строительство и обслуживание объекта производственного назначения | 10 | **413 431 233** | 82 680 000 | **1 450 817** | 0,1041 га – охранная зона канализационного коллектора; 0,0208 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 8* | в районе ул. Волгоградская | 1025064 | 0,2967 | строительство и обслуживание спортивных сооружений | 10 | **284 485 039** | 56 890 000 | **1 306 845** | ограничений в использовании земель нет |
| 9* | ул. Высоковская | 1027693 | 0,4733 | строительство и обслуживание объекта питания с общественно-бытовыми помещениями | 10 | **569 063 463** | 113 810 000 | **5 941 339** | ограничений в использовании земель нет |
| 10* | ул. М.Л.Мошенского | 1025787 | 0,9446 | строительство и обслуживание автостоянки | 10 | **805 087 845** | 161 010 000 | **1 513 733** | 0,0060 га – охранная зона газопровода среднего давления |
| 11* | ул. Базановой, 4 | 1026802 | 0,0187 | установка и обслуживание объекта торговли | 10 | **34 435 705** | 6 880 000 | **1 407 198** | 0,0032 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением до 1000В; 0,0056 га – охранная зона водопровода |
| 12* | ул. Красногвардейская | 1026816 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 1 | 10 | **2 503 654** | 500 000 | **1 529 617** | 0,0002 га охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 13* | ул. Красногвардейская | 1026817 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 2 | 10 | **2 503 654** | 500 000 | **1 001 905** | 0,0021 га – охранная зона линии электропередачи напряжением до 1000В |
| 14* | ул. Красногвардейская | 1026818 | 0,0035 | строительство и обслуживание объекта социального назначения № 3 | 10 | **2 503 654** | 500 000 | **1 001 905** | ограничений в использовании земель нет |

*** – повторные аукционные торги**

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. №462, и состоится при наличии не менее двух участников.**

**Перечень документов, представляемый участником аукциона:** заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков); **гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **индивидуальным предпринимателем** – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь** – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; **представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык; **представителем иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано** подписать с организатором аукционных торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Порядок осмотра предмета аукциона (лота) осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924.**

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

- в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881.
- в течение 2 рабочих дней после перечисления платежей заключить с Брестским горисполкомом договор аренды земельного участка;
- в течение 2 месяцев со дня подписания договора аренды земельного участка обратиться за государственной регистрацией договора аренды участка, а также прав на него;
- приступить к занятию земельного участка (начать строительство, иное освоение земельного участка) в течение 6 месяцев (для юридического лица, индивидуального предпринимателя) и в течение 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения).

**Аукцион состоится 18 сентября 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 14.08.2014 г. до 17.30 12.09.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65. Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www gki.gov.by**

# ШТО ЯДЗІМ? ЯК ВЫПІВАЕМ?


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Паталагічная ж пякотка — працяглая, і час ад часу яна паўтараецца. Узмацняецца ў становішчы лежачы, суправаджаецца кіслай адрыжкай, кіслым прысмакам у роце, болем у страваводзе. Гэты боль ужо сведчыць аб фарміраванні эзафагіту — запаленчага працэсу ў слізістай стрававода. Ён можа быць спачатку павярхоўным, аднак пры адсутнасці лячэння сфарміруецца эрозія, а затым — язва. Пацыентаў з язвавым паражэннем стрававода не так і шмат, але назіраецца яно ў любым узросце. Пастаянныя закіды кіслага змесціва фарміруюць стрававод Барэта, а гэты стан ужо здольны прывесці да анкалагічнай праблемы.

З'яўленне працяглай пякоткі без пераядання ўказвае на неабходнасць звароту да ўрача. Такому пацыенту будзе праведзена эндаскапічнае даследаванне, паколькі яно дазваляе добра бачыць парушэнне функцыі сфінктара, кардыяльнага жому. Прымяняецца для дыягностыкі і сутачная страўнікавая pH-метрыя, калі праз нос у страўнік уводзіцца спецыяльны зонд з капсулай, якая ўстанаўліваецца над страваводным сфінктарам і ловіць кожную хвалю закіду.

**— Вядома, што ў абсалютнай большасці выпадкаў язва страўніка і дванаццаціперснай кішкі абумоўлена наяўнасцю ў арганізме такой бактэрыі, як хелікабактар пілары. Яна можа перадавацца ад чалавека чалавеку з пацалункамі, праз агульны посуд і г. д. А ці можна «атрымаць» яе падчас эндаскапічнага метаду даследавання?**

— Некалі мы сапраўды сутыкаліся з праблемай парушэння дэзынфекцыйнай апрацоўкі эндаскапічных зондаў. Ад пацыентаў сапраўды паступалі скаргі. Рызыка, хоць і мінімальная, занясення інфекцыі падобным чынам сапраўды існуе. Аднак зараз прымяняецца вельмі дасканалая дэзынфекцыя. Гэтаму пытанню надаецца вялікая ўвага.

**— Ці абавязкова з гастрыту разаўецца язва?**

— Зусім не абавязкова. Такая хвароба, як гастрыт, ёсць, па сутнасці, ва ўсіх. Нават у маладых. Калі вывучыць біяптат, узяты са страўніка любога чалавека, абавязкова можна знайсці нейкія клетачныя змяненні — кшталту тых, што вы маеце на ўвазе пад гастрытам. Аднак сёння гастраэнтэролагі карыстаюцца дакладным еўрапейскім стандартам: пры адсутнасці марфалагічных змяненняў — эрозій ці язваў — дыягназ гучыць як «функцыянальная страўнікавая дыспепсія». Тэрмін «гастрыт», такім чынам, прымяняецца толькі пры наяўнасці эрозій. Дыягназ у такім выпадку гучыць так: «Хранічны гастрыт з эрозіямі».

Эрозія — гэта павярхоўнае пашкоджанне слізістай абалонкі страўніка, яно добра відаць у эндаскопе і, як правіла, звязана з наяўнасцю хелікабактарнай інфекцыі. Значыць, можна спрагназаваць, што наступным этапам захворвання будзе язва. Наогул трэба разумець, што гэтая бактэрыя — хелікабактар пілары — пасяляецца ў падслізістым слоі цела страўніка. Аднак разам з ежай мікроб здольны перамясціцца ў дванаццаціперсную кішку, дзе таксама правакуе язвавае пашкоджанне.

**— Эндаскапічнае даследаванне можа не выявіць хелікабактарную інфекцыю?**

— Звычайна падчас такога даследавання абавязкова бярэцца два або тры біяптаты з цела страўніка і дванаццаціперснай кішкі (у еўрапейскіх клініках — пяць). Гэтага дастаткова, каб выявіць хелікабактарную інфекцыю, якая засяляе ўвесь страўнік. Калі ж хвораму сказалі, што бактэрыя выяўлена ў дванаццаціперснай кішцы, то трэба разумець, што ёсць яна і ў страўніку. Дзякуючы ўзятаму біяптату становіцца магчымым правядзенне марфалагічнага даследавання і пастаноўкі дакладнага дыягназу адносна таго ж гастрыту. Можна высветліць, які менавіта гастрыт мае быць — з атрафіяй, гіпертрафіяй ці метаплазіяй.

> **Навукова абгрунтаваны метад лячэння жоўцекаменнай хваробы — ранняе выдаленне жоўцевага пузыра. Менавіта ранняе, бо той, хто зацягвае з падобным умяшаннем, ахвяруе печанню.**

За мяжой такое даследаванне праводзіцца толькі пад анестэзіяй — 20-хвілінным наркозам. У нас жа прэпараты для кароткатэрміновага сну пакуль не зарэгістраваны. У некаторых бальніцах і платных клініках прапануецца, хіба, больш працяглы наркоз. У масавай жа практыцы для анестэзіі ротаглоткі выкарыстоўваюць раствор лідакаіну. Пераноснасць інвазіўных умяшанняў, да якіх адносіцца і эндаскапія, залежыць ад індывідуальных асаблівасцяў чалавека.

**— Жоўцекаменная хвароба — гэта толькі лад харчавання ці спадчынная схільнасць?**

— У першую чаргу — характар харчавання. Распаўсюджанасць такой паталогіі, як жоўцекаменная хвароба, у нашай краіне вельмі высокая, паколькі многія злоўжываюць тлустай ежай. Размова ў гэтым выпадку ідзе пра халестэрынавыя камяні. У жоўцевым пузыры назапашваюцца раставаральныя тлустыя жоўцевыя кіслоты, якія выпадаюць у асадак. Чым больш тлушчу чалавек атрымлівае, тым вышэй рызыка развіцця жоўцекаменнай хваробы. Ёсць і генетычная схільнасць, але гэта другасны момант.

> **Кожны здаровы павінен сачыць за тым, каб харчавацца збалансавана. Абавязкова штодня трэба ўжываць 500–600 г агародніны і садавіны. Смажанае, тлустае варта істотна абмяжоўваць.**

Цікава, што тлустай ежай часцей злоўжываюць мужчыны, аднак захворванне больш распаўсюджана сярод жанчын. Так, на аднаго хворага мужчыну прыпадае 4–6 жанчын з такой паталогіяй. Гэта таму, што прыгожы пол мае дэфіцыт руху.

Навукова абгрунтаваны метад лячэння жоўцекаменнай хваробы — ранняе выдаленне жоўцевага пузыра. Менавіта ранняе, бо той, хто зацягвае з падобным умяшаннем, ахвяруе печанню. Камяні, якія назапашваюцца ў жоўцевым пузыры, абцяжарваюць адток жоўці з печані. Яе лішак застойваецца ва ўнутрыпячоначных пратоках і пачынае разбураць пячоначныя клеткі. Развіваецца халестатычны гепатыт, які працякае вельмі агрэсіўна.

Кожны здаровы павінен сачыць за тым, каб харчавацца збалансавана. Абавязкова штодня трэба ўжываць 500–600 г агародніны і садавіны. Смажанае, тлустае варта істотна абмяжоўваць.

**— Што з'яўляецца разбуральным для падстраўнікавай залозы?**

— Першы вораг гэтага органа — алкаголь. Фарміраванне панкрэатыту ў абсалютнай большасці выпадкаў у тых жа мужчын звязана менавіта са злоўжываннем алкаголем. Пашкоджанне ў гэтым выпадку адбываецца апасродкавана. Алкаголь стымулюе ўтварэнне салянай кіслаты ў страўніку. Вялікая колькасць гэтай кіслаты актывізуе работу падстраўнікавай залозы, дзе пачынае выпрацоўвацца вялікая колькасць стрававальных ферментаў, неабходных нам для пераўтраўлівання ежы. Аднак столькі ліпазы, амелазы і трыпсіну арганізму не патрэбна. Калі ж чалавек толькі паднімае чарку і наогул не закусвае, то гэтых ферментаў выпрацоўваецца надзвычай многа. У выніку гэты лішак пачынае ператраўліваць сам орган і тым самым проста вынішчае залозу. Вось так развіваецца панкрэатыт — запаленчы працэс.

Другая па частаце прычына ўзнікнення панкрэатыту — жоўцекаменная хвароба. Дробныя камяні, пясок імкнуцца трапіць у праток жоўцевага пузыра, а ён мае агульнае вусце з пратокам падстраўнікавай залозы. Частка жоўцевых камянёў такім чынам можа трапіць у праток падстраўнікавай залозы і перашкодзіць адтоку панкрэатычнага соку. Такі механізм больш уласцівы «жаночаму» панкрэатыту, хоць у апошнія гады мы ўсё часцей рэгіструем у жанчын і панкрэатыты алкагольнага паходжання.

Трэцяя прычына — курэнне. Даказана, што прадукты тытунёвага дыму могуць прывесці да хранічнага панкрэатыту. Механізм падобны на той, што мае быць пры ўжыванні алкаголю. Акрамя таго, нікацін выклікае спазм пратокаў падстраўнікавай залозы, а любая перашкода ў пратокавай сістэме запавольвае адток ферментаў і правакуе самапераўтраўліванне органа.

Свой шкодны ўнёсак мае і тупая траўма жывата ў вобласці залозы. Моцны ўдар можа сфарміраваць дэфармацыю пратоку, з-за чаго спачатку ўзнікне яе запаленне, а потым і звужэнне.


Фота Вольгі ЛАСКІ.

**— Ці ёсць эфектыўныя спосабы аднаўлення печані?**

— Самым эфектыўным будзе здаровы лад жыцця. Ніякім чынам вы не адновіце гэты орган, калі будзе выстаўлены дыягназ «гепатыт». Пашкоджанні печані — вельмі вялікая праблема ў гастраэнтэралогіі. Адзін расійскі акадэмік сказаў, што печань выконвае такі аб'ём работы, які не выконваюць ні сэрца, ні ныркі, ні падстраўнікавая залоза. Гэта ўсе віды абменаў (бялковы, тлушчавы, мінеральны, пігментны), сінтэз гармонаў і вітамінаў, выпрацоўка рэчываў, якія валодаюць згусальнымі і антызгусальнымі вартасцямі.

Галоўны вораг печані — алкаголь. У структуры прычын, якія выклікаюць пашкоджанні печані, 60 працэнтаў прыпадае на алкагольныя гепатыты. Зараз шмат кажуць пра дапушчальныя дозы алкаголю. Сусветная арганізацыя аховы здароўя рэкамендуе не ўжываць мужчынам звыш 40–60 г этанолу ў суткі, жанчынам — звыш 20–30 г. Наша насельніцтва ігнаруе гэтую рэкамендацыю. Тым не менш, алкаголь, ужыты звыш гэтай дапушчальнай нормы, становіцца ядам для пячоначнай клеткі. Алкаголь перапрацоўваецца менавіта печанню. Тая ж падстраўнікавая залоза пакутуе ад спірту, як мы казалі, апасродкавана, а вось печань — непасрэдна. Што адбываецца з пячоначнымі клеткамі, якія перапрацоўваюць алкаголь? Яны гінуць. Гэты працэс называецца некрозам, а некроз і ёсць гепатыт.

> **Даказана, што прадукты тытунёвага дыму могуць прывесці да хранічнага панкрэатыту. Механізм падобны на той, што мае быць пры ўжыванні алкаголю. Акрамя таго, нікацін выклікае спазм пратокаў падстраўнікавай залозы.**

Другі вораг печані — вірусы. Вядома сем відаў вірусных гепатытаў — A, B, C, D, E, F, G. Асабліва небяспечныя тыя, што перадаюцца праз кроў, — B, C, D. Найбольш распаўсюджаны першыя два віды. Можна быць проста носьбітам гэтых вірусаў, але пры гэтым заражаць іншых. Калі пад уздзеяннем нейкіх фактараў — скажам, прастуды, нерацыянальнага харчавання, уздзеяння алкаголю — імунітэт аслабне, то можна і захварэць. Захворванне заяўляе аб сабе тады, калі вірус пачынае актыўна размнажацца. Праяўляецца гэта агульнай слабасцю, перыядычным павышэннем тэмпературы цела, зніжэннем вагі, парушэннем сну, цяжарам у правым падрабрынні, а таксама пажаўценнем склер вачэй, скуры. Але апошняя прыкмета не абавязковая.

Урач-тэрапеўт можа западозрыць гепатыт па агульным аналізе. Лячэнне гепатытаў працяглае, даволі цяжкае і не дае стапрацэнтнага вызвалення віруса з арганізма. Гепатыты небяспечны найперш фарміраваннем цырозу — працэсу, калі замест загінулых пячоначных клетак з'яўляецца грубая злучальная тканка. Гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да фарміравання партальнай гіпертэнзіі, паколькі фіброзная тканка сціскае пячоначныя сасуды, а па іх вянозная кроў адцякае да сэрца. З-за таго, што кроў блакіруецца, развіваецца партальная гіпертэнзія, а далей — асцыт, або вадзянка.

Існуюць і гепатыты, не звязаныя з ужываннем алкаголю або наяўнасцю вірусаў. Прычына іх развіцця можа быць звязана з атлусценнем (калі лішак халестэрыну нізкай шчыльнасці закупорвае пячоначная клеткі), цукровым дыябетам, хуткай стратай масы цела пры анарэксіі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**



З нараджэннем **дачушкі** шчыра віншуем фотакарэспандэнта газеты **Марыну Бегункову і яе мужа Сяргея Сідаровіча!** Маленькай зычым расці здаровенькай, яе бацькам — згоды, цярпення, жыццёвай мудрасці... І, вядома ж, грошай — яшчэ і на брацікаў-сястрычак!

**Звяздоўцы.**

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

**Уважаемые акционеры Открытого акционерного общества**
**«Белорусский народный банк»**
**25 августа 2014 года в 10.00 состоится внеочередное Общее собрание акционеров Открытого акционерного общества «Белорусский народный банк».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ внеочередного Общего собрания акционеров:**
1. О распределении прибыли Банка за 6 месяцев 2014 года.

Внеочередное Общее собрание акционеров состоится в помещении ОАО «БНБ-Банк» по адресу: 220012, г. Минск, пр-т Независимости, 87а.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг для составления списка лиц, имеющих право на участие в Собрании, – 15 августа 2014 г.

С информацией, относящейся к вопросам, включенным в повестку дня, а также проектами решений можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 87а, с 15 августа 2014 в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (перерыв с 12.30 до 13.15).

Регистрация акционеров по месту проведения собрания с 09.00 до 10.00 по документу, удостоверяющему личность, а представителей акционеров-юридических лиц — по доверенности.

**Телефон для справок: + 375 17 309 7 309**

**www.bnb.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 07 июня 2013 г. УНП 100513485.

УНП 101015738

**РУП «Белпочта»**
**объявляет о проведении переговоров по выбору подрядной организации для выполнения работ на объекте**
**«Гидравлическое испытание системы теплоснабжения здания главного почтамта по пр. Независимости, 10 в г. Минске».**

Процедура переговоров состоится «20» августа 2014 года в 10.00 по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 10.

Контакты для получения дополнительной информации: отдел капитального строительства – тел. 293-55-29, 293-55-28.

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
14 ЖНІЎНЯ 2014 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15750)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Віталь ВАРАНКО:

# «Я МОГ СТАЦЬ ІНЖЫНЕРАМ, АЛЕ МУЗЫКА ПЕРАМАГЛА»

**«Чалавек-баян», «баяніст-віртуоз» — часцей за ўсё менавіта так прадстаўляюць Віталя Варанко. Ён двойчы станавіўся стыпендыянтам Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі, перамагаў на розных конкурсах і фестывалях у Еўропе, Расіі і ва Украіне. Кар'еру ж эстраднага выканаўцы хлопец распачаў, калі прыйшоў на праект «Акадэмія талентаў» і стаў супрацоўнічаць з вядомым беларускім прадзюсарам Уладзімірам Кубышкіным. Сёння 22-гадовы Віталь працягвае спасцігаць музычнае майстэрства ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і адначасова робіць новыя крокі на шляху да вялікай сцэны. Адзін з нядаўніх — перамога ў конкурсе «Заспявай.by». Падчас сустрэчы артыст распавёў не толькі пра яе, але і пра сваю любоў да беларускай мовы, натхненне прыгажосцю і калекцыю інструментаў...**

***— Пасля конкурсу вы вырашылі працягваць стварэнне беларускамоўных песень?***

— Так, я ўжо працую над наступнай кампазіцыяй, якую таксама спрабую пісаць на беларускай мове. Думаю, што працягну супрацоўніцтва з Віталем Ражковым (паэт, на верш якога запісана песня «Вяртайся». — **Аўт.**). У яго ўжо ёсць ідэі з тэкстам, а я ствараю мелодыю.

***— Жаданне размаўляць па-беларуску да вас прыйшло не так даўно... Як поспехі?***

— Мае веды пакуль вымушаюць жадаць лепшага, але я не саромеюся размаўляць па-беларуску і заўсёды думаю на роднай мове. Лічу сябе сапраўдным беларусам. І мне хацелася б, каб хоць сваімі песнямі я змог натхніць іншых людзей думаць на беларускай мове. Я ўпэўнены, што сапраўдныя беларусы пазітыўныя, умеюць радавацца жыццю. Таму не заўсёды разумею нашых музыкантаў, якія выконваюць сумныя песні. Сам хацеў бы развіваць у музыцы толькі пазітыўныя ноткі.

***— Вы самі яскравы прыклад пазітыўнага чалавека. Як гэта ўдаецца?***

— Сёння я не раскрыю свайго сакрэту. Скажу толькі, што мяне падмацоўвае музыка, якую я слухаю. Яна бывае вельмі рознай. Зараз, напрыклад, я «падсеў» на музыку групы «Depeche Mode». Таксама ў маім плэй-лісце апошні альбом «Muse». Спадабалася нават апошняя пласцінка Лэдзі Гагі. Я заўсёды шукаю цікавінку ў кожным выканаўцы, таму што калі чалавек дасягнуў таго, што яго ведаюць мільёны, то ў яго абавязкова ёсць чаму павучыцца. І ў беларусаў ёсць усе шанцы стаць вядомымі ва ўсім свеце музыкантамі. Узяць тых жа «Песняроў» — яны змаглі. Значыць, і іншыя маюць шанц. Трэба проста рабіць сваё на якасным сусветным узроўні.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***



Важакі хлеб

# НЕАД'ЕМНАЯ ЧАСТКА... МЯНЕ,

## альбо Замест водпуску — у лагер

**Ці бачылі вы маладога спецыяліста, які пасля адпрацоўкі па размеркаванні штогод вяртаецца на былое месца сваёй працы проста з вялікай любові да яго? Выпускніца Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Вольга КУЛАГА якраз з такіх: сёлета яна падчас водпуску на асноўным месцы работы прыехала ў дзіцячы лагер «Агеньчык» пад Мінскам у складзе педагагічнага атрада «Ветразь». Карэспандэнт «Чырвонкі» сустрэўся з дзяўчынай і даведаўся, з чым звязана яе любоў да «лагернай» працы.**

— У 133-й мінскай школе, дзе я вучылася, працаваў проста цудоўны педагог Юрый Уладзіміравіч Гардзіенка, — узгадвае Вольга, — вучыў нас харэаграфіі і сусветнай мастацкай культуры, але быў больш, чым проста настаўнік. Для мяне ён стаў прыкладам. Я захаплялася тым, як гэты чалавек працуе. Думаю, менавіта Юрый Уладзіміравіч зрабіў на мяне найвялікшы ўплыў, і дзякуючы гэтаму настаўніку я выбрала месцам сваёй вучобы БДПУ. Дарэчы, тую самую спецыяльнасць, на якой вучыўся мой педагог, — «Сусветная і айчынная культура, рытміка і харэаграфія».

***(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)***



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Эх, каб яшчэ...

# УНЁСАК ДЛЯ АЛЬБЫ

## Чым запомніўся Нясвіж валанцёрам?

**Удзельнікі міжнароднага экалагічнага валанцёрскага лагера «Спадчына Радзівілаў-2014» падзяліліся з «Чырвонкай» сваімі ўражаннямі ад праекта, які быў рэалізаваны рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя клубаў ЮНЕСКА» пры непасрэдным удзеле Музея-запаведніка «Нясвіж». Усяго ў лагеры прынялі ўдзел 16 валанцёраў з Беларусі, Украіны, Расіі, Узбекістана, Арменіі, Сербіі і Кітая.**

### ПАМІЖ ЕЎРАПЕЙСКАСЦЮ І САМАБЫТНАСЦЮ

**Дырэктар таварыства аховы жывёл у Ташкенце і эксперт экалагічнага руху Мадзіна САІДКАРЫМАВА** Беларуссю зацікавілася даўно. «Аднойчы я была ў азербайджанскім валанцёрскім лагеры, дзе ўбачыла прэзентацыю вашай краіны, — распавядае дзяўчына. — Тады і «загарэлася» думкай прыехаць сюды, пачала шукаць валанцёрскія праекты». У выніку Мадзіна правяла ў Беларусі паўтара месяца, і за гэты час наведала «кітайскі» і «французскі» лінгвістычныя лагеры, паўдзельнічала ў праекце «Пілігрым» — паездцы па святых мясцінах Беларусі, паспела «паваланцёрыць» у Цэнтры экалагічных рашэнняў, наведала Мінск, Хатынь, Віцебск, Гомель, Полацк. Апошняй жа кропкай яе маршруту па Беларусі стаў Нясвіж.

«Лагер быў блізкага для мяне экалагічнага накірунку, — кажа Мадзіна. — У асноўным мы ачышчалі ад смецця тэрыторыю парку Альба, а таксама даведваліся шмат цікавага пра расліны і дрэвы, якія там высаджвалі. Леснікі, з якімі мы працавалі, былі вельмі адкрытымі і прыязнымі да нас. А ў вольны час хадзілі на экскурсіі па Нясвіжы».

Штодня адзін з удзельнікаў лагера арганізоўваў дзень культуры сваёй краіны. Напрыклад, у дзень Узбекістана валанцёры прачыналіся пад узбекскую музыку, вучылі простыя словы «прывітанне», «дзякуй», а яшчэ Мадзіна частавала сваіх новых сяброў сушанай дыняй. «Мне вельмі спадабаліся прэзентацыі Сербіі і Арменіі. Цяпер хачу трапіць у гэтыя краіны, — з захапленнем прызнаецца Мадзіна. — А што да Беларусі, то гэта залатая сярэдзіна паміж еўрапейскасцю і самабытнасцю. Зараз рэкламую вашу краіну ўсім сябрам і знаёмым — багатая культура і гісторыя, чыстае паветра, лясы і азёры — мне б хацелася прыехаць сюды яшчэ і не раз».

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
14 08 2014 г.

Паспец за 100 хвілін

# КАРАТКЕВІЧ — СУПРАЦЬ МІТРЫЧАВА

## Процістаянне завяршылася перамогай беларуса

**Гамяльчанін Генадзь Караткевіч, якога ў свеце называюць беларускім геніем спартыўнага праграмавання і які зараз атрымлівае вышэйшую адукацыю ў Санкт-Пецярбургу, не дазваляе пра сябе забываць: з рэгулярнай перыядычнасцю ў Беларусь прыходзяць паведамленні пра новыя яго перамогі. Чарговая вяршыня, якая пакарылася беларусу,— фінал міжнароднага чэмпіянату па спартыўным праграмаванні «Яндэкс. Алгарытм-2014».**




«Яндэкс. Алгарытм» уяўляе сабой адкрыты міжнародны чэмпіянат па праграмаванні, аднак, у адрозненне ад сусветна вядомых спаборніцтваў сярод студэнтаў-праграмістаў АСМ — ІСРС, канкурэнцыя тут не камандная — вынікі падводзяцца ў асабістым заліку.

Сёлета ўдзел у «Яндэкс. Алгарытме» ўзялі каля 4 тысяч спартсменаў-праграмістаў з больш як 70 краін свету (у тым ліку і 161 беларус) — гэта рэкордныя за ўсю гісторыю правядзення чэмпіянату лічбы.

У межах спаборніцтваў удзельнікам трэба было прайсці шэсць раўндаў па 100 хвілін кожны, з якіх першыя два былі кваліфікацыйнымі (для выхаду з іх трэба было рашыць як мінімум адну задачу). Далей удзельнікаў чакалі яшчэ тры адборачныя раўнды. У фінал трапілі толькі 25 спартсменаў, якія набралі найбольшую колькасць балаў, у тым ліку і адзін беларус. Дарэчы, фінальная частка спаборніцтваў прайшла ў Берліне, у нядаўна адкрытым там офісе «Яндэкса».

У фінале сустрэліся добра вядомыя ў ІТ-свеце праграмісты: прызёры «Яндэкс. Алгарытма-2013», пераможцы і ўдзельнікі АСМ — ІСРС, TopCoder Open, супрацоўнікі Google і Facebook. Па правілах, да ўдзелу ў спаборніцтвах не дапускаюцца толькі супрацоўнікі кампаніі «Яндэкс». Заданні для «Алгарытма-2014» рыхтавала міжнародная каманда, у якую ўвайшлі праграмісты з Расіі, Беларусі, Польшчы і ЗША.

Як і летась, сярод галоўных фаварытаў былі беларус, студэнт Генадзь Караткевіч, які выступае на спаборніцтвах пад «нікам» tourist, і Пётр Мітрычаў — адзін з самых тытулаваных удзельнікаў, супрацоўнік маскоўскага офіса Google.

Фіналістам былі прапанаваны шэсць алгарытмічных задач і 100 хвілін на іх рашэнне. На перамогу мог разлічваць толькі той, хто справіцца з найбольшай колькасцю задач і атрымае за іх меншую колькасць штрафных хвілін. Задачы фіналісты маглі здаваць як «у адкрытую», так і «ў цёмную». Калі задача здаецца ў адкрытую, удзельнік можа быць упэўнены, што ў выніку яе правільнага рашэння яму будуць налічаны адпаведныя балы, якія тут жа з'явяцца у анлайн-табліцы (але табліцу могуць бачыць усе канкурэнты). А калі адказ быў няправільны, задача вярталася ўдзельніку і той атрымліваў за яе штрафныя балы.

Адкрыта здаваць задачу можна колькі заўгодна разоў, але за кожную такую спробу дабаўляюцца штрафныя балы. А калі здаваць задачу «ў цёмную», яна не вяртаецца і балы за яе налічваюцца толькі пасля завяршэння фіналу. У гэтым выпадку трэба быць упэўненым на ўсе 100 працэнтаў у правільнасці свайго рашэння.

Летась лепшым вынікам у фінале былі тры рэшаныя задачы. З імі справіўся Генадзь Караткевіч, які гуляў «у цёмную», але гэта не перашкодзіла яму стаць пераможцам. У гэтым годзе пасля завяршэння 100 хвілін, адведзеных на фінал, высветлілася, што 12 фіналістаў здалі па 4 заданні, ўсе «ў цёмную», у надзеі атрымаць менш штрафных хвілін. Разбор заданняў паказаў, што гамяльчанін за 100 хвілін правільна рашыў чатыры задачы з шасці і прыйшоў на фініш з найменшай колькасцю штрафных хвілін (66 хвілін).

Другое месца заняў японец Хосака Кацухіра (Такійскі ўніверсітэт), які таксама рашыў чатыры задачы, але набраў 90 штрафных хвілін. Трэцяе месца — у кітайца Ван Кіншы з універсітэта Цінхуа. Генадзь Караткевіч атрымаў за перамогу 300 тысяч расійскіх рублёў (або 8,5 тысячы долараў) і паклаў у сваю скарбонку чарговы тытул.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Варта нагадаць, што ва ўзросце 11 гадоў Гена стаў самым юным удзельнікам міжнароднай школьнай алімпіяды па інфарматыцы і самым юным прызёрам гэтых інтэлектуальных спаборніцтваў: з першай жа спробы ён здолеў заваяваць сярэбраную ўзнагароду. Трэба патлумачыць, што ўзроставы цэнз для ўдзельнікаў алімпіяды складае 20 гадоў і на алімпіяду прыязджаюць, як правіла, выключна старшакласнікі. Затым ён заваяваў 6 залатых медалёў і стаў тройчы абсалютным пераможцам гэтых спаборніцтваў. А паступіўшы вучыцца ў Санкт-Пецярбургскі нацыянальны даследчы ўніверсітэт інфармацыйных тэхналогій механікі і оптыкі, у складзе яго каманды яшчэ на першым курсе заваяваў і тытул абсалютнага чэмпіёна свету па праграмаванні сярод студэнтаў.*

Ведай нашых!

# Крэатыўны падыход да алгарытмаў

**На XXVI міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы ў Тайване беларускія школьнікі заваявалі адзін сярэбраны і два бронзавыя медалі.**

Прычым упершыню ў гісторыі нацыянальнага алімпіяднага руху медалём на міжнародных спаборніцтвах па інфарматыцы была ўзнагароджана дзяўчынка. Дзесяцікласніца віцебскай гімназіі № 1 Барбара Кускова заваявала ў Тайбэі бронзавы медаль. Таксама «бронза» ў выхаванца Гомельскага абласнога ліцэя Дзімы Дзямідкі. А з «серабром» вярнуўся на радзіму дзесяцікласнік іўеўскай сярэдняй школы № 1 Аляксей Вісцях.

Алімпіяда традыцыйна праходзіла ў два туры. Падчас кожнага школьнікам адводзілася 5 гадзін на рашэнне трох алгарытмічных задач. Усе задачы мелі крэатыўны характар, таму ўдзельнікам трэба было не проста прадэманстраваць вельмі высокі ўзровень пабудовы складаных алгарытмаў, навыкі праграмавання і тэсціравання, але і адшукаць новую ідэю і спосаб рашэння, праявіць арыгінальны падыход. Працэс рашэння мог адрозніваецца ад таго, што прапаноўвалі аўтары задачы.

У кожнай задачы былі свае падзадачы, за правільнае рашэнне якіх таксама налічваліся пэўная колькасць балаў. Максімальна за рашэнне адной задачы можна было атрымаць 100 балаў. 600 балаў — «залаты максімум» — узялі на алімпіядзе чацвёра школьнікаў (з Расіі, ЗША, Кітая і Аўстраліі). А ўсяго ў спаборніцтвах прынялі ўдзел больш як 300 школьнікаў з 83 краін. Да арганізацыі алімпіяды мелі дачыненне Тайваньскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт і вядучыя сусветныя ІТ-кампаніі.

Падрыхтоўкай беларускай зборнай займаліся асістэнт кафедры вылічальнай матэматыкі БДУ Аляксей Тоўсцікаў і пераможцы алімпіяд мінулых гадоў, цяпер студэнты БДУ і БДУІР. А ў групе падтрымкі нашых школьнікаў быў вопытны «баец» Сяргей Кулік — тройчы прызёр міжнародных спаборніцтваў па інфарматыцы, зараз першакурснік БДУ. Летась ён заваяваў для беларускай школы залаты медаль.

Умовы правядзення адборачнага этапу перадалімпіядных збораў, калі непасрэдна фарміравалася каманда, былі максімальна набліжаны да ўмоў міжнародных спаборніцтваў. Школьнікам прапаноўваліся рэдкія і незнаёмыя задачы, рашэнне якіх яны не маглі нідзе адшукаць. А падчас трэніровачных збораў штодзённыя заняткі доўжыліся каля 6 гадзін. Такім чынам, шлях у Тайвань атрымаўся для юных праграмістаў зусім не лёгкім…

# УНЁСАК ДЛЯ АЛЬБЫ

## ПРЫВІТАННЕ З СЕРБІІ І РАДЗІВІЛЫ «ПА-КІТАЙСКУ»

**Студэнтка першага курса філалагічнага факультэта ўніверсітэта Бялграда Івана ГЕОРГІЕЎСКІ** даведалася пра лагер «Спадчына Радзівілаў» праз Фэйсбук і вырашыла адправіцца ў Беларусь. «Я вельмі актыўна вандрую, стараюся не ўпускаць валанцёрскія магчымасці,— адзначае Івана.— Да гэтага шмат чытала пра вашу краіну, намалявала ў галаве «свой» вобраз — і ўсе мае чаканні спраўдзіліся, убачыла ўсё ў «натуральную велічыню».

**Даведка**

*Парк Альба знаходзіцца на паўднёвай ускраіне Нясвіжа. Два стагоддзі таму ён выкарыстоўваўся Радзівіламі ў якасці летняй рэзідэнцыі: тут знаходзіліся эрмітаж, палац, звярынец і нават шпалерная мануфактура. У Альбе Радзівілы ладзілі прыёмы для гасцей. У нашы дні ад былой велічы амаль нічога не засталося: лес напаўзапушчаны, а на месцы добра прадуманай воднай сістэмы захаваліся толькі рэшткі каналаў, якія паспелі абмялець.*

Дзяўчына кажа, што найбольш ёй спадабаліся людзі, з якімі давялося папрацаваць: «Увечары мы садзіліся ў кола, частаваліся нацыянальнымі стравамі, і пасля ўсе задавалі мне пытанні. Я пачаставала сяброў стравай з вараных ягад, падобнай на джэм, і ракіяй — нацыянальным сербскім напоем. Яшчэ мяне здзівіла, што валанцёры добра ведаюць пра Ніколу Тэслу і яго адкрыцці. Шмат распытвалі пра Косава і вайну ў Сербіі».

**Чэн ЮАНДЗІ з Кітая вучыцца ў Беларусі на падрыхтоўчым факультэце гістарычнага факультэта БДУ.** «Калі я пачынаў вывучаць гісторыю Беларусі, то даведаўся пра знакаміты Нясвіжскі замак, унесены ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА,— заўважае хлопец.— Таму я даўно хацеў паехаць сюды на экскурсію. Дзякуючы лагеру я атрымаў такі шанц і за 10 дзён даведаўся шмат цікавага пра Нясвіжскі замак і найбагацейшы род Радзівілаў».

Адным з крытэрыяў адбору валанцёраў у лагер было валоданне рускай мовай, на якой камунікавалі паміж сабой удзельнікі лагера. «Я пакуль што не вельмі добра размаўляю па-руску,— адзначае Чэн.— Таму і не змог правесці дзень Кітая: распавесці пра нашу гісторыю і культуру мне пакуль што складана. Затое я дапамог перакласці на кітайскую мову буклет пра Нясвіжскі замак. Спадзяюся, што ў наступным годзе таксама вазьму ўдзел у рабоце лагера і змагу «прэзентаваць» сябрам Кітай. Я ўдзельнічаў першы раз у падобным праекце, таму вопыту ў мяне мала. Затое даведаўся шмат цікавага. Асабліва пра лад жыцця Радзівілаў».

**Кацярына РАДЗЮК.**

**Ангеліна ЖАДЗЬКО, праграмны дырэктар лагера:**

*— Здавалася б, што можна паспець за такі кароткі тэрмін? Аказваецца, нямала: мы ўнеслі свой уклад у аднаўленне парку Альба, заклалі алею валанцёраў у дэндрарыуме, але галоўнае — пазнаёміліся і пасябравалі. Ціхія сажалкі, векавыя дубы… І хаця лесапарк яшчэ знаходзіцца ў паўзапушчаным стане, я ўпэўнена, што наперадзе ў яго — лепшыя дні. Усе тайны і загадкі Альбы яшчэ давядзецца раскрыць вучоным і археолагам. Прыемна ўсведамляць, што ва ўсім гэтым ёсць і частка тваёй працы, твой асабісты ўклад у адраджэнне гістарычных і прыродных помнікаў».*



Удзельнікі лагера.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

# У юных матэматыкаў — «золата»

**Каманда беларускіх школьнікаў заваявала дыплом І ступені і залатыя медалі на VI Міжнародным турніры юных матэматыкаў у Германіі.**

У склад нацыянальнай зборнай увайшлі ліцэісты БДУ Антон Варанько, Дзмітрый Румянцаў, Антон і Сяргей Шамякавы, навучэнцы сталічнай гімназіі № 41 Мікалай Прохараў і Барыс Серанкоў.

Міжнародны турнір юных матэматыкаў уяўляе сабой калектыўныя спаборніцтвы. Афіцыйная мова турніру — англійская. Задача ўдзельнікаў — не проста ўмець рашаць складаныя матэматычныя задачы, але і аргументавана адстойваць свой пункт погляду ў публічных дыскусіях. Спаборніцтвы складаліся з некалькі матэматычных баёў, падчас якіх юным матэматыкам даводзілася па чарзе спачатку самім прадстаўляць і абараняць атрыманыя вынікі, а затым выступаць у ролі апанентаў і рэцэнзентаў для іншых удзельнікаў.

Сёлета заяўкі на ўдзел у міжнародным турніры падалі 12 краін, але да спаборніцтваў былі дапушчаны толькі 9, у тым ліку Беларусь, Балгарыя, Германія, Іран, Непал, Расія, Румынія, Украіна і Францыя.

Прызавое месца беларускія школьнікі падзялілі з равеснікамі з Францыі.

А з 45-й Міжнароднай фізічнай алімпіяды беларусы прывезлі чатыры сярэбраныя медалі. Узнагароды ў Астане заваявалі адзінаццацікласнікі Ліцэя БДУ Аляксей Горлач і Стасіс Чучурка, Антон Хвалюк (сталічная гімназія № 29) і Ілья Перапечка (гімназія № 3 г. Салігорск). Усяго ўдзел у спаборніцтвах узялі каля 400 школьнікаў з 86 краін.

Удзельнікам трэба было прадэманстраваць свае веды і навыкі ў двух турах: тэарэтычным і эксперыментальным. Дарэчы, упершыню за ўсю 45-гадовую гісторыю алімпіяды заданне для другога тура распрацавалі супрацоўнікі фізічнага факультэта БДУ — загадчык кафедры агульнай фізікі Анатоль Слабадзянюк і загадчык вучэбнай лабараторыі Мікалай Казлоўскі. А абсталяванне для рашэння эксперыментальнай задачы зрабілі на навукова-вытворчым рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Актыў БДУ».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# НЕАД'ЕМНАЯ ЧАСТКА... МЯНЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ»).*

Яшчэ на пачатку сваёй вучобы ва ўніверсітэце Вольга даведалася пра існаванне педагагічнага атрада «Ветразь».

— Мне казалі, што ў «Ветразі» можна рэалізаваць свае ідэі, паказаць увесь свой крэатыў, папрацаваць у цудоўным калектыве. Я загарэлася ідэяй працы ў такім атрадзе. У выніку на трэцім курсе прайшла адбор і паехала ў летнік. І гэта сапраўды аказалася проста неверагодна. Я працавала ў адной з самых моцных «звязак» (так называюць педагагічны калектыў на адной змене. — **Аўт.**) і атрымала каштоўны вопыт. Гэта цяжка перадаць словамі — мы былі сапраўдная сям'ёй. Праца з дзецьмі ладзілася. Змена прайшла, што называецца, «з душой». З тых часоў я — неад'емная частка «Ветразя». Дакладней, ужо «Ветразь» — неад'емная частка мяне.

Амаль усе, хто калі-небудзь меў дачыненне да атрада, не забываюць пра гэты перыяд у сваім жыцці. Многія прыязджаюць сюды год за годам, каб зноў «ажывіць» гэтыя адчуванні. Некаторыя «ветразеўцы», як кажа суразмоўца, бяруць на працы водпуск і замест звыклага адпачынку едуць сюды... Сыходзяць толькі тыя, у каго не застаецца нават маленькай магчымасці зноў далучыцца да атрада. Але і яны не забываюцца на сяброў і заўжды гатовы сустрэцца.

Асноўнае месца працы дзяўчыны — сталічны Дзіцячы музычны тэатр «Рэва». Там яна вучыць дзяцей асновам балета, эстраднага танца. Акрамя таго, Вольга прымае ўдзел у пастаноўках беларускіх музеяў — у прыватнасці, тых, што адбываюцца падчас «Ночы музеяў». Дарэчы, на педагагічнай працы, харэаграфіі і ўвогуле мастацтве яе інтарэсы не заканчваюцца. Вольга захапляецца культурай і філасофіяй Усходу: яна вегетарыянка, прытрымліваецца здаровага ладу жыцця.

— Трэба разумець, што ёсць агульначалавечыя каштоўнасці, якія трэба «прышчэпліваць» у першую чаргу: не чыніць зла, не падманваць і верыць у тое, што ты робіш. Напэўна, гэта галоўныя думкі, якія я спрабую данесці да дзяцей, — кажа Вольга.

За гады працы ў лагеры Вольга выконвала абавязкі звычайнага важатага, педагога дадатковага навучання і старшага педагога. Цяпер яе работа вельмі адрозніваецца ад райнейшай: усё ж такі новая пасада часткова звязана з адміністрацыйнай працай. Але Вольга ўсё адно шукае кантакт з дзецьмі. І знаходзіць! Здзіўляе, як спадарыня Кулага па імёнах падзывае да сябе дзетак, якія ў лагеры ўсяго некалькі дзён, цікавіцца, як у іх справы, жартуе, дапамагае. Вольга прызнаецца, што праца з дзецьмі ёй падабаецца больш за арганізацыйныя абавязкі.


Вольга КУЛАГА разам са сваімі падапечнымі.

Узімку ў «Агеньчыку» размяшчаецца санаторый для дарослых, летам жа тут адпачываюць дзеці. У першую чаргу — дзеці супрацоўнікаў УП «Мінгаз». Удзельнікі кожнай змены дзеляцца на два атрады — старшы і малодшы. Атрады выбіраюць сабе тэматычныя назвы, якія замацоўваюцца за імі да канца змены. Сёлета тут жывуць «Афрыканскія зулусы» і «Вялікае Княства Літоўскае».

У летніку створаны ўсе ўмовы для добрага баўлення часу, а некатораму абсталяванню лагера могуць пазайздросціць нават самыя вядомыя ўстановы дзіцячага адпачынку. У «Агеньчыку» ёсць масажныя кабінеты з найноўшай тэхнікай, апараты для прыгатавання кіслародных какгэйляў, інгалятары і многае іншае. У лагеры рэалізуецца безліч мерапрыемстваў і праграм, якія могуць зацікавіць дзяцей.

Асабліва нас уразіла так званая «казкатэрапія», калі самым юным адпачывальнікам чытаюць добрыя і цікавыя казкі. Таксама можна ўзгадаць мерапрыемствы накшталт «Планеты Галівуд», калі дзеці робяць тэатральныя пастаноўкі паводле сцэн са знакамітых фільмаў, ці, напрыклад, мерапрыемства «Рэстаран»: важатыя на адзін вечар становяцца афіцыянтамі і ў сталовай абслугоўваюць сваіх «патрабавальных кліентаў». Ёсць тут і заняткі па інтарэсах: па вакале, уласнаручным вырабе ўпрыгажэнняў і прадметаў дызайну і нават дыджэінгу — стварэнні музыкі пры дапамозе звядзення некалькіх гукавых дарожак на пласцінках.

— Калі казаць пра цяжкасці, то на першае месца я паставіла б самакантроль, — распавядае Вольга, — тут трэба заўсёды быць сабраным і сканцэнтраваным. Трэба сачыць за сваімі паводзінамі і знешнім выглядам, бо банальную ісціну пра асабісты прыклад ніхто не адмяняў. Дзеці спачатку глядзяць, як чалавек выглядае і паводзіць сябе (ці ўсміхаецца ты, ці здольная ісці на кантакт), а ўжо потым слухаюць. Таксама кожнаму педагогу трэба памятаць, што для яго не існуе фразы «Я не хачу» і «Я не магу». Гэта датычыцца, у першую чаргу, маладых спецыялістаў.

На пытанне аб адрозненнях сучасных дзяцей ад старэйшых пакаленняў, Вольга ўпэўнена адказвае: «Нічога прынцыпова не змянілася». На яе думку, у так званым «грамадстве спажывання» дзяцей стала больш складана здзівіць. Многія на пытанне «Што табе сёння спадабалася найбольш?» адказваюць: «Смачная вячэра». Па меркаванні Вольгі, найгалоўнейшая задача сучасных педагогаў і бацькоў — паказваць дзецям, што існуе і іншы, духоўны свет, які не менш важны за свет рэчаў.

— Думаю, вельмі важна даносіць да дзетак тое, што смачна паесці — гэта, безумоўна, добра. Але падзяліцца з тым, каму не хапае ежы, — яшчэ лепш.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**


Фотаздымкі Сяргея НІКАНОВІЧА.
Спаборніцтвы па валейболе ў самым разгары.

*Адпачыць і зарабіць*

# «МЫ ЕДЗЕМ ДА ВАС НАЙПЕРШ ПА ЎРАЖАННІ»

**Днямі на пляцоўцы першага спарткомплекса БНТУ прайшоў спартыўны фестываль для ўдзельнікаў студэнцкіх атрадаў. Яго арганізатарам выступіла Мінская гарадская арганізацыя Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. «Байцы» мерыліся сіламі ў чатырох дысцыплінах: міні-футболе, валейболе, стрытболе (вулічным баскетболе, у якім каманды гуляюць на адно кальцо) і армрэслінгу. У камандных відах за прызы турніру змагалася 26 калектываў з атрадаў розных ВНУ, у спаборніцтвах па армрэслінгу — каля 50 чалавек.**

**Свае каманды на фестываль заявілі і тры расійскія ВНУ, студэнты якіх цяпер працуюць у складзе зводных студатрадаў у Мінску: Нацыянальны даследчыцкі Томскі політэхнічны ўніверсітэт, Кабардзіна-Балкарскі дзяржаўны ўніверсітэт і Уральскі дзяржаўны ўніверсітэт шляхоў зносін. Карэспандэнты «Чырвонкі» паназіралі за спаборніцтвамі і даведаліся, што вабіць замежных студэнтаў у будатрадаўскім жыцці.**

Расказвае Мікіта ФАДЗЕЕЎ, студэнт 3 курса факультэта атамнай электраэнергетыкі Томскага політэхнічнага ўніверсітэта:

— Я ў студатрадаўскім руху ўжо тры гады. Да гэтага ездзіў на рыбаперапрацоўчы завод на Сахаліне, а таксама працаваў праваднiком у цягніках. У Расіі студатрадаўскі рух пазіцыянуецца як платформа для выхавання студэнцкага адзінства. Гэты рух яднае, дазваляе знайсці сяброў і павандраваць. Сёлета з'явілася магчымасць патрапіць у Беларусь, паглядзець на краіну, на Мінск, пазнаёміцца з цікавымі людзьмі. Я без ваганняў згадзіўся на такую прапанову адміністрацыі ўніверсітэта. Усяго ў Мінск з Томска прыехала васямнаццаць чалавек, а ўвогуле з Расіі — каля сямідзесяці. Некалькі атрадаў з нашай ВНУ зараз працуюць на будаўніцтве атамнай электрастанцыі ў Астравецкім раёне. Мы з сябрамі працуем у Мінску, на адным з будаўнічых прадпрыемстваў. Будуем жылы дом у мікраражне «Зялёны Луг». Кладзём тратуарную плітку і падводзім каналізацыю.

***— Якія ўражанні ад беларускай сталіцы?***

— Нас засялілі ў новыя інтэрнаты ў Студэнцкай вёсцы. Наколькі я ведаю, падчас чэмпіянату свету па хакеі там жылі фанаты замежных зборных. Умовы вельмі добрыя. Усе пытанні, якія ў нас узнікалі, максімальна хутка вырашаліся. У Мінску ўразілі, у першую чаргу, людзі: мне здаецца, што беларусы больш адкрытыя, здольныя ісці на кантакт, чым расіяне. Увогуле, тут ёсць атрады, якія прыязджаюць у Мінск не першы раз — напрыклад, хлопцы з Кабардзіна-Балкарыі. Думаю, тое, што людзі з радасцю едуць у Беларусь штогод, — лепшы паказчык.

***— Ці была ў вас якая-небудзь культурная праграма?***

— Так, безумоўна. Мы прыехалі ў Мінск яшчэ 3 ліпеня, і адразу трапілі на парад, прымеркаваны да Дня Незалежнасці Беларусі, наведалі новы Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Штотыдзень мы арганізавана ездзім у экскурсіі па Беларусі. Былі ў Мірскім замку, Белавежскай пушчы, Нацыянальнай бібліятэцы, на «Лініі Сталіна», на хакейным матчы ў «Мінск-Арэне». На выхадных па ўласнай ініцыятыве з'ездзілі ў Брэсцкую крэпасць — гэта было незабыўнае падарожжа і шыкоўныя ўражанні. Яшчэ плануем патрапіць на Мінскае мора і ў аквапарк.

***— Як табе здаецца, ці вельмі адрозніваецца цяперашняя Беларусь ад Расіі? Многія расіяне любяць нашу краіну менавіта за тое, што «адчуваюць сябе як дома».***

— Я не сказаў бы. Узяць, напрыклад, мову. Беларускую ў Мінску пачуць цяжка, але нават руская мова «ў выкананні» беларуса гучыць зусім інакш: гукі больш мяккія і працяглыя. Адрозніць беларуса па маўленні зусім проста. Мы таксама вывучылі некаторыя словы. Напрыклад, я ведаю, што грошы можна «зарабіць». А яшчэ ўразілі назвы пасад і арганізацый: гаркам, першы сакратар. Тое, што такія рэчы захаваліся з савецкага часу, мяне здзівіла. Але на больш шчыльнае знаёмства з беларускай культурай і гісторыяй у нас проста не хапае часу.

***— Ці многа вам плацяць за працу у студатрадзе?***

— Нядрэнна, у сярэднім дванаццаць мільёнаў рублёў за сорак працоўных дзён. Цэны ў Мінску параўнальныя з буйнымі гарадамі Сібіры — такімі, як Томск. Але, паўтаруся, мы едзем сюды не па грошы, а па ўражанні. Дарэчы, адна з самых пазітыўных рэчаў — беларускія прадукты, іх вельмі добрая якасць. У Томскай вобласці знаходзіцца самае вялікае ў свеце балота, таму ўсё расце фактычна на вадзе, ніякага смаку ў ежы няма. А ў крамах большасць прадуктаў якраз мясцовай вытворчасці. Таму ў Беларусі мы харчуемся з задавальненнем.

***— Якія ў цябе ўражанні ад сённяшняга мерапрыемства?***

— Мы сабралі дзве каманды — па стрытболе і па футболе. Думаю, у першай дысцыпліне ў нас добрыя шанцы на поспех, бо ўсе хлопцы гуляюць у зборных камандах інстытута і раёна. Ды і ў міні-футбольнай камандзе ў нас ёсць моцныя выканаўцы — варатар гуляе за зборную універсітэта.

...Фестываль працягваўся да позняга вечара. Нарэшце былі вызначаны пераможцы ва ўсіх дысцыплінах. Што цікава, у кожным відзе спорту лепшымі аказаліся беларускія каманды. У спаборніцтвах па стрытболе — каманда атрада імя 70-годдзя вызвалення Беларусі (БНТУ), у міні-футболе — каманда атрада «Гвардзейцы» (БДМУ). Найлепшымі валейбалісткамі сталі дзяўчаты са зборнай БДТУ (яна аб'яднала ўдзельніц адразу двух студатрадаў: «Штаб Абітурыент» і «Альбатрос»). Уладальнік самай моцнай рукі і пераможца турніру па армрэслінгу — студатрадавец Алег Назараў (БНТУ).

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**


Фота Надзеі БУЖАН.

# ШЧАСЦЕ — ЗРАБІЦЬ ШЧАСЛІВЫМ ІНШАГА



Члены валанцёрскага атрада «Клопат».

**Мы поўныя энергіі і жадання зрабіць гэты свет лепшым. «Але што можа зрабіць моладзь, яны ж яшчэ, па сутнасці, дзеці?» — спытаеце вы. Прызнаюся, такое пытанне ўзнікла і ў нас. Але мы хутка знайшлі выдатнае рашэнне — арганізаваць валанцёрскі атрад «Клопат». Яго дэвіз — «Жыць, каб дапамагаць». І гэта не пустыя словы.**

Нашы валанцёры шэфствуюць над ветэранамі вайны і працы, над адзінокімі пажылымі людзьмі. Мы дапамагаем ім у быце, віншуем са святамі і проста падтрымліваем зносіны, якіх ім так не хапае. Таксама ліцэісты наведваюць дзяцей з прытулку Рэчыцкага сацыяльна-педагагічнага цэнтра, гуляюць з імі, дапамагаюць рабіць хатнія заданні. Мы хочам зрабіць жыццё гэтых дзяцей лепшым, аддаць ім часцінку свайго душэўнага цяпла.

Наша дзейнасць гэтым не абмяжоўваецца. Валанцёры пастаянна ладзяць розныя акцыі і дабрачынныя канцэрты. Яскравым прыкладам можа служыць — ён ужо стаў традыцыйным — дабрачынны канцэрт «Мы разам», дзе выступаюць не толькі дзеці, але і настаўнікі. Усе грошы, сабраныя падчас яго, мы пераводзім на рахунак Рэчыцкага дзіцячага дома. Перад Новым годам мы арганізоўваем акцыю «Калядны падарунак», у якой бяруць удзел усе ліцэісты і педагогі. Мэта акцыі — дапамагчы дзецям-сіротам ажыццявіць нават самыя неверагодныя жаданні. Валанцёры атрада «Клопат» збіраюць грошы, каб парадаваць дзетак і зрабіць іх хоць на нейкі час шчаслівымі. Як гэта прыемна — бачыць радасныя дзіцячыя вочы!

Мы не прапускаем ніводнай важнай падзеі ў нашым горадзе. Дапамагаем раённай арганізацыі Чырвонага Крыжа ў правядзенні акцый па барацьбе з курэннем, са СНІДам, з туберкулёзам. Мы актыўна ўдзельнічаем у азеляненні горада. І, у рэшце рэшт, старанна вучымся, каб у будучыні прынесці карысць людзям. І не важна, кім мы будзем — настаўнікамі, урачамі, эканамістамі або праграмістамі. Галоўнае, што кожны будзе выконваць сваю працу з любоўю.

Няхай нас называюць «страчаным пакаленнем» і «дзецьмі інтэрнэту». Няхай мы смешна апранаемся і размаўляем на слэнгу. Але мы маладыя, гарачыя, поўныя энергіі! Мы не абыякавыя да праблем іншых людзей! Мы яшчэ зможам змяніць гэты свет!

**Лізавета ЛІСОЎСКАЯ,**
**выпускніца 11 класа Рэчыцкага раённага ліцэя.**

**ПРА АЎТАРА**

***Лізавеце —16 гадоў. Раней яна захаплялася народнымі танцамі, зараз больш любіць вышываць і вязаць. Захапляецца чытаннем фантастыкі. Сёлета на абласной алімпіядзе па рускай мове ўзяла дыплом трэцяй ступені — дарэчы, як і летась. Яшчэ любіць падарожнічаць.***

***Лізавета вучылася ў адным класе з сястрой-блізніцай Алінай. Кажа, што ў іх добрыя, сяброўскія стасункі. А вось інтарэсы ў жыцці трохі розныя: калі Аліна збіралася паступаць на лагапеда, дык наш аўтар — на славянскую філалогію ў БДУ.***

Мы–макія!

# «МОЖА, ВЫЖЫВЕМ?..»


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
Мемарыял на месцы канцлагера ў вёсцы Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна беларускім дзецям — ахвярам фашызму.

**Мой аднавясковец Сцяпан Гардзеевіч Сушчык дзевяцігадовым дзіцем быў вывезены ў фашысцкі канцлагер. Забыць пра вайну ён не можа: гэта не ў яго сілах. Ды такое і не забываецца...**

— Я нарадзіўся ў 1934 годзе ў вялікай сям'і, у якой было шасцёра дзяцей — пяць хлапчукоў і адна дзяўчынка. Вайна не паступала ў дзверы, яна ўварвалася як ураган, як смерч у нашу вёску Букча Лельчыцкага раёна. Адразу ж двух маіх старэйшых братоў мабілізавалі ў армію. Аднавяскоўцы, у тым ліку і мая сям'я (маці, бацька, я, мая сястра Каця, браты Якаў і Фёдар), зімой 1942 года вырашылі ўцячы ў лес, таму што захопнікі прыйшлі і ў нашу вёску.

***— Як жа вы патрапілі ў канцлагер?***

— Летам 1943 года ў Букчу прыбыў карны атрад — спецыяльны батальён з ліку крымінальнікаў і фашысты. Яны пачалі ланцужком «прачэсваць» лес, шукаючы партызан. У лесе фашысты натрапілі на мірных жыхароў і забралі ў палон маю сям'ю. На шчасце, брат Фёдар і сястра Каця здолелі ўцячы, а потым іх забрала да сябе мая цётка і гадавала да канца вайны. Сем'яў, якіх забралі ў палон з маёй вёскі, было пяць. Калі нас вялі, то мой бацька заўважыў, што ў групе палонных ёсць хлопчык, Іван Карпавец. Яго бацька быў партызанам, і хлопчыка маглі расстраляць адразу ж. Тады мой бацька паклікаў Івана да сябе і кажа: «Кажы, што ты — мой сын. Будзеш усюды з намі. Можа, разам усе і выжывем?» Прывялі нас у вёску. Мая вёсачка ўжо была спалена немцамі. Паўсюль — сляды бою. Нас пагрузілі ў машыну, у якой ужо былі палонныя з вёскі Дзяржынск, і павезлі да вёскі Тонеж. Там насупраць бальніцы па вуліцы Маладзёжнай была выкапана канава. Машына з палоннымі пад'ехала да яе, і нам загадалі злезці, зайсці ў гэтую канаву і сесці на калені. Палонныя здагадаліся, што іх будуць расстрэльваць, таму што фашысты рыхтавалі зброю, патроны. Каб вы толькі чулі, што там пачалося! Крык, лямант, плач... І тут пачуўся стрэл у канцы вёскі. Фашысты замітусіліся (мабыць, спужаліся партызан), хуценька нас пагрузілі і павезлі далей.

Прывезлі на чыгуначную станцыю, у вёску Старушкі Петрыкаўскага раёна. Людзей пагрузілі ў таварныя вагоны. Цягнік ехаў доўга, спыняючыся і на некалькі гадзін, і на паўдня: мабыць, дагружалі палонных. Нас не кармілі і не паілі. Некаторыя паміралі і ляжалі на падлозе. А потым былі яшчэ перасадкі. Так мы патрапілі ў нямецкі канцлагер, які быў размешчаны на тэрыторыі былой Заходняй Германіі, у горадзе Найс.

***— Што вы памятаеце з жыцця ў канцлагеры?***

— Сярод палонных у лагеры былі і французы, і палякі, і рускія, і беларусы. Былі людзі і з нашага раёна, з вёсак Стадолічы, Дзяржынск. Лагер быў абнесены калючым дротам, па якім праходзіў ток. Стаялі дзве вышкі з вартавымі. Вакол лагера хадзіла варта з аўчаркамі, каб ніхто не ўцёк. А ніхто і не ўцякаў: куды ж уцякаць? Дарослыя хадзілі на працу. Кожную раніцу было пастраенне, пасля якога дарослыя ішлі працаваць — на завод, на поле, да фермера... А дзеці ўвесь дзень хадзілі па тэрыторыі лагера. Кармілі толькі два разы (калі гэта можна было назваць кармленнем): раніцай і ўвечары. Дарослым давалі 300 грамаў хлеба ўдзень, а дзецям — 150 грамаў і «баланду», гарачую ваду, у якой плавалі шалупінне ад бульбы, буракоў, а часта можна было вылавіць і мыш. А хлеб! Хіба той кавалачак можна было назваць хлебам? У канцлагерным хлебе, які быў напалову з драўняным пілавіннем, можна было знайсці і шапачкі ад жалудоў, і бульбу, і карэньчыкі. Але дзеці добра ўсвядомілі, што смачнейшы хлеб з бярозавым пілавіннем, а з хваёвым — вельмі горкі, і жывот пасля яго вельмі баліць. Ежы не хапала, людзі галадалі. Былі і такія дні, калі вязняў увогуле не кармілі. Многія паміралі з голаду або ад інфекцыйных хвароб. Нічога няма страшней за голад. У той час здавалася, што памерці ад кулі — значыць пашчасціла, а паміраць галоднай — страшна.

**Рускія пачалі ўзважваць вязняў. Узважылі і мяне. Вага майго цела была 13 (!) кілаграмаў. 13 кілаграмаў у 11 гадоў — уявіце сабе толькі!**

А яшчэ памятаю, што ў лагеры былі вельмі маленькія дзеці, такія малыя, што не ўмелі нават размаўляць: мабыць, было тады ім па годзіку ці па два ўсяго. Гэтыя дзеці ўвесь час плакалі, клічучы маці, а мы супакойвалі іх, як маглі. Немцам не падабаўся плач дзяцей...

***— Ці спадзяваліся вы ў той час на тое, што зможаце выжыць і вярнуцца назад, у сваю родную вёску?***

— Безумоўна, і я, і мая сям'я марылі аб тым, што ўсё будзе добра, што нас вызваляць. Але былі і такія дні, калі кожны з нас чакаў смерці і думаў, што ён не выжыве ў такіх умовах. Але вось выжыў... Мне часта снілася мая вёсачка Букча, і заўсёды ў маіх снах была ежа: свежае пахучае-пахучае цёпленькае малако і хлеб, які пякла мая маці і клала на стол. Ён так прыемна пах, што ад гэтага паху кружылася ў сне галава і я прачынаўся. І тады думаў: «Якое шчасце быць на волі і ўдосталь наесціся хлеба!» Некалькі разоў я вельмі слабеў. Было такое пачуццё, што ўсё нутро гарэла агнём і вельмі сціскала горла: дыхаць не было сілы. Тады бацькі аддавалі мне свой хлеб некалькі дзён запар, каб я трохі паправіўся, памацнеў. А тых вязняў, якія паміралі, закопвалі па некалькі дзясяткаў кожныя 3—4 дні ў агульнай яме, якую рыхтавалі самі палонныя. Цяжка расказваць пра гэта...

***— Ці адчувалася ў канцлагеры, што хутка — перамога?***

— Так. Несумненна. Мой бацька баяўся, што з ім і маці можа што-небудзь здарыцца і я магу згубіцца, таму ён вывучыў са мною наш адрас і правяраў яго веданне амаль кожны дзень, каб у выпадку вызвалення з лагера мяне маглі адправіць дадому, у родную вёску.

***— Што яшчэ было ў лагеры, аб чым памятаеце і зараз?***

— Я ў той час добра разумеў тое, што вартавалі нас і кіравалі працай дарослых немцы. Але незразумела было тое, што сярод вартавых былі і рускія. Калі я ў першыя дні пачуў рускую мову, то ўзрадаваўся: думаў, што рускі — значыць свой. Але я памыляўся. Рускія паліцаі паводзілі сябе нашмат горш за фашыстаў: яны хацелі выслужыцца, даказаць, што ненавідзяць свой народ. А яшчэ памятаю, як у канцлагер прывезлі італьянцаў. З імі вельмі жорстка абыходзіліся: жылі яны ў падвалах, кармілі іх горш, чым нас, таму многія з іх паміралі.

***— Ці памятаеце вызваленне лагера?***

— Гэта была вясна 1945 года. Лагер вызвалілі амерыканцы. Усе былі рады да беспрытомнасці. Крычалі, абдымалі вызваліцеляў. Потым усіх савецкіх палонных адправілі да Дрэздэна. Там, каля ракі Эльбы, нас чакалі савецкія войскі. Рускія пачалі ўзважваць вязняў. Узважылі і мяне. Вага майго цела была 13 (!) кілаграмаў. 13 кілаграмаў у 11 гадоў — уявіце сабе толькі!

***— Як вы вярнуліся на Радзіму?***

— На працягу некалькіх тыдняў нас адкормлівалі, таму што многія не вынеслі б дарогі, пераезду: кожны дзень давалі ежы больш і больш, дзецям яшчэ — па кавалачку шакаладу. Вязні супакоіліся, радаваліся, набіраліся сіл. А потым на цягніках нас перавезлі ў Беларусь. Тут, на Радзіме, у Мазыры, службы НКУС узялі адпячаткі пальцаў (мабыць, сярод палонных шукалі здраднікаў) і адпусцілі маю сям'ю.

***— Як вы адчулі сябе дома?***

— Мне здавалася, што я нарадзіўся нанова. Скончылася вайна. Я радаваўся жыццю, хаця вайна прынесла многа няшчасцяў: загінулі на фронце два мае браты, сястра Каця захварэла на адзёр і памерла, ад брата Якава не было ніякіх вестак. Потым Якаў прыслаў нам ліст, у якім паведамляў, што пасля вызвалення з лагера яго прызвалі ў армію (яму ўжо споўнілася 19 гадоў) і ён будзе служыць да 1951 года.

***— А як склалася ваша асабістае жыццё пасля вайны?***

— Дзякуй Богу, добра. 14 студзеня 1959 года ажаніўся з Нінай Міхайлаўнай. У 1960 годзе ў нас нарадзіўся першынец — сынок Пётр, у 1962-м — сын Коля, а ў 1964 годзе — дачушка Танечка. Сыны зараз працуюць у Санкт-Пецярбургу. Прыязджаюць у госці. Я да іх езджу, хаця зараз даволі рэдка. На жаль, дачкі ўжо няма...

Дзяржава клапоціцца пра такіх, як мы: атрымліваю добрую пенсію і радуюся мірнаму жыццю. У апошні час збіраўся ўжо некалькі разоў напісаць пра жыццё ў канцлагеры ў якую-небудзь газету, але так і не адважыўся. Думаю: «А хіба я такі адзін? Такіх тысячы. А можа, і нецікава атрымаецца, не надрукуюць маю «пісаніну».

❍ ❍ ❍

Мы выйшлі з хаты з такім адчуваннем, быццам самі пабывалі ў тым страшным канцлагеры разам з ім. Расхваляваны Сцяпан Гардзеевіч выйшаў правесці нас да брамы, а потым яшчэ доўга глядзеў услед.

Я — адзін з соцень тысяч маладых людзей, я адзін з тых, хто бачыць прыгажосць у самым простым і звычайным, адзін з тых, хто любіць бязмежна свой народ, сваю краіну. І насуперак усім песімістам, якія крытычна ставяцца да сучаснай моладзі, хачу сказаць: «Мы — будучае Беларусі, мы — сапраўдныя, мы — такія!»

**Андрэй АЛЕСІЧ,**
**выпускнік 11 класа Букчанскай сярэдняй школы Лельчыцкага раёна.**

**ПРА АЎТАРА**

***Сёлета мы адзначылі 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вайна — яна была рознай для тых, каму давялося перажыць яе жахі... Пра лёс аднаго з колішніх малалетніх вязняў і піша наш аўтар.***

***Пра сябе Андрэй распавёў, што сярод любімых прадметаў у школе былі беларуская літаратура і гісторыя Беларусі. Захапленняў у 16-гадовага юнака шмат: ён любіць слухаць беларускую музыку, шмат чытае, цікавіцца гісторыяй сваёй краіны, сочыць за навінамі, малюе, піша вершы.***

***— Маё асноўнае жыццёвае памкненне, — кажа Андрэй, — быць карысным чалавекам для сваёй сям'і, для сваёй краіны.***

# Саламяны рай Алы Сурмінавай

**Мастацкаму кіраўніку ўзорнага тэатра моды «Спадчына» Ваўкавыскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Але Аляксееўне Сурмінавай летась была ўручана прэмія «Чалавек года Гродзеншчыны». Юныя ўдзельніцы тэатра пад яе кіраўніцтвам заваёўваюць сэрцы гледачоў усіх узростаў: ад прыгажосці незвычайных убораў вочы нельга адарваць. На пытанне «Чаму «Спадчына»? Ала Аляксееўна адказала: «Усё ад нашых продкаў». І натхнёна пачала расказваць, што ад бабуль, мамы і таты атрымала яна гэтую бясцэнную «спадчыну».**

...Выхаваннем Алы ў дзяцінстве пэўны час займаўся родны брат бацькі. Па рабоце яму з Дома быту прывозілі лоскуты тканіны. Ала з вялікай радасцю станавілася гаспадыняй гэтага «багацця». Схаваўшыся ледзь не з галавой у куфар з рыззём, яна займалася любімай справай — шыла ўбранне для лялек. Гэта і стала пачаткам яе творчага шляху. Амаль з нічога яна стварала шэдэўры лялечных убораў.

У школе настаўнікі заўважылі здольнасці дзяўчынкі да малявання. Яе эцюды атрымліваліся лёгкія, светлыя, як і яна сама. А з якой нецярплівасцю штогод чакала Новага года! Загадзя рыхтавала казачныя касцюмы на ранішнік сабе і сястры. З года ў год навагоднія касцюмы Алы і Марыны Варабей былі самыя яркія, не падобныя на іншыя, і прызнаваліся лепшымі нават самым строгім журы.

Здавалася, што выбар прафесіі пасля заканчэння школы назаўсёды разлучыць Алу з творчасцю. Яна скончыла ПТВ-117 г. Мінска, атрымала прафесію шліфоўшчыка, працавала на падшыпнікавым заводзе. Але творчы чалавек заўсёды знойдзе магчымасць самарэалізавацца. Ала актыўна ўключылася ў грамадскую работу. Хапала часу і на спорт. Захаплялася валейболам, плаваннем. Выканала нарматыў кандыдата ў майстры спорту па спартыўным арыентаванні. Актыўная грамадская работа не перашкодзіла, а нават паспрыяла асабістаму шчасцю. На трэніроўках пазнаёмілася з будучым мужам. А хутка і вяселле справілі. Так Ала Варабей стала Сурмінавай.

У Ваўкавыску ў гэты час адкрываўся завод. У маладой сям'і з'явілася перспектыва атрымаць уласную кватэру. Пераехалі. І ні разу аб гэтым не пашкадавалі. Каб не пакідаць дзяцей адных, давялося перайсці працаваць нянечкай у дзіцячы садок. Вось тут яна змагла праявіць свае здольнасці ў поўнай меры. Афармляла пакой, музычную залу, рыхтавала дэкарацыі да спектакляў. І ўсё гэта рабіла з душой, укладваючы ўсю сваю фантазію. Прыгажосць, створаную рукамі Алы Сурмінавай, заўважыла дырэктар Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі.

І вось ужо трынаццаць гадоў Ала Аляксееўна з'яўляецца кіраўніком узорнага тэатра моды «Спадчына». За гэты час гурткоўцамі падрыхтавана больш за сорак калекцый. «І кожная з іх цікавая па-свойму», — лічыць Ала Аляксееўна. Падобных няма. Адна выканана з дапамогай аплікацыі, другая — інкрустацыі, трэцяя — пляцення. Ёсць калекцыі з саламяных трубачак, павучкоў. Першая калекцыя «Саламянае лета» — з бартоўкі з выкарыстаннем рыбалоўнага шнура, макрамэ і саломкі. «Гэтая калекцыя, — успамінае Ала Аляксееўна, — запомнілася на ўсё жыццё, бо, па-першае, мела вялікі поспех на конкурсе ў Гродне, а ў Мінску атрымала бясспрэчную перамогу і, па-другое, натхніла на далейшую працу».

Вырабы з саломы здаўна лічацца адным з традыцыйных народных беларускіх рамёстваў. Каб яна стала «паслухмянай», неабходна дасканала ведаць сакрэты гэтага матэрыялу. «Калі вы будзеце згінаць яе рэзка, то сцябло паломіцца. А калі спачатку намочыце, а затым марудна, асцярожна пачняце згінаць, то вы зможаце прыдаць ёй форму, якую захочаце», — спасцігаю я прамудрасці саломапляцення.

Поспех і прызнанне гледачоў акрылілі. Хацелася тварыць! Адразу ўзяліся за калекцыю, якую назвалі «Алеся». Мадэлі «Васілінка», «Паўлінка», «Яніна», «Кася» (і, вядома ж, «Алеся") падрыхтавалі ўсяго за два месяцы. Гэта была першая ў краіне калекцыя, выкананая ў тэхніцы саломапляцення, адзначаная прэміямі на конкурсах «Вясенні капеж» і «Калейдаскоп фантазіі» ў 1998 годзе.



Калекцыі з саломкі патрабуюць многа сіл і часу. Матэрыял для работы Ала Аляксееўна рыхтуе выключна сама. Едзе на жытнёвыя палеткі. Беражліва, каб не пашкодзіць сцяблінкі, жне сярпом, бо салома пасля камбайна ўся паламана і зусім непрыдатная для пляцення ці аплікацыі. Каб сплесці спадніцу, спатрэбіцца немалы сноп саломы, а то і не адзін. Цікава, што з часткі сцябла ад коласа да першага калена плятуцца вітушкі. Другая частка — доўгая — ідзе на «зубатку», а ніжняя, самая тоўстая, на аплікацыю ці інкрустацыю.

Цяжка стрымаць сваю цікавасць. Пытаюся:

— Гэтыя спадніцы і галаўныя ўборы можна насіць?

— Безумоўна. Гэта не мёртвая экспазіцыя.

— А які век у саламянай сукенкі?

— На жаль, невялікі. Салома — недаўгавечны матэрыял. Некалькі гадоў — і яна пачынае рассыпацца, — тлумачыць Ала Аляксееўна.

Кожная новая калекцыя — як свята, як падарунак лёсу. Калекцыя 2001 года так і называецца — «Падарунак восені». Сукенкі «Арэхавы рай», «Фасолевы санет», «Казка старога гарбуза», «Кукурузная аповесць» і іншыя выкананы ў тэхніцы нанізвання зерня фасолі, кукурузы, пладоў каштанаў, насення гарбузоў. Кожнае зярнятка знайшло сваё месца ў касцюме. Затое якія казачныя сукенкі атрымаліся! А вось белыя кветкі, выкананыя ў тэхніцы макрамэ для калекцыі «Вясна ў раі», — сапраўдны цуд!

— Ні ў адной кнізе вы не знойдзеце нічога падобнага, — расказвае Ала Аляксееўна. — Гэта наша, аўтарскае. А колькі працы! Адна толькі кветка для мадэлі «Рамонкавы бум» мае звыш чатырох з паловай тысяч вузлоў. Гэта самая складаная калекцыя. Такой вы не ўбачыце нідзе...

Ёсць у «Спадчыны» калекцыі мадэлей з кардону, футра і скуры, дроту, аднак саламяны цуд уражвае найбольш. Сваімі карункавымі саламянымі касцюмамі нашы мадэлі заваявалі сімпатыі ў гледачоў «Славянскага базару» і ўжо не адзін раз выступалі з канцэртнымі нумарамі разам з вядомымі беларускімі выканаўцамі Кірылам Слукой, Сашам Нэма і юнай пераможцай дзіцячага «Еўрабачання» Вольгай Сацюк.

...Ала Аляксееўна амаль ніколі не купляе падарункі ў крамах. Вырабляе іх сваімі рукамі. Кожнай хатняй рэчы дае другое жыццё. Дома сваімі рукамі робіць усё. У яе кватэры саламяныя шторы, абажур, на сценах — пано з саломкі. Кожная рэч арыгінальная, непаўторная. З астаткаў салёнага цеста вырабляе карціны дзіўнай прыгажосці, са скуры і шкла — кулоны, займаецца керамікай, цудоўна вяжа. Яе кватэра нагадвае музей народнай творчасці.

**Каб салома стала «паслухмянай», неабходна дасканала ведаць сакрэты гэтага матэрыялу. «Калі вы будзеце згінаць яе рэзка, то сцябло паломіцца. А калі спачатку намочыце, а затым марудна, асцярожна пачняце згінаць, то вы зможаце прыдаць ёй форму, якую захочаце».**

Іскрынкі спадчыннага «Божага дару» ад бабуль і мамы перадаліся дочкам Алы Аляксееўны. Старэйшая, Наташа, яшчэ ў школе дапамагала маме прыгажосць ствараць, удзельнічала ў паказах мадэляў калекцый. Закончыла Мірскае мастацкае вучылішча. Інкрустатар. Ёсць перамогі ў абласным і рэспубліканскіх конкурсах. Малодшая, Вольга, стварае адмысловыя скураныя вырабы. Бацькі ганарацца сваімі дочкамі. І для гэтага ёсць усе падставы.

Ала Аляксееўна шчодра дзеліцца сваімі напрацоўкамі з калегамі. Да яе звяртаўся з гільдыі саломапляцення Вялікабрытаніі Хэйзэл Котхіл, дырэктар музея саломапляцення штата Каліфорнія з ЗША Морган Овэнс Кэлі, старшыня гільдыі саломапляцення з Аўстраліі Ноні Макфарлей. Часта наведваюцца на заняткі да Алы Аляксееўны педагогі і зацікаўленыя жыхары горада і раёна. І на ўсіх у яе хапае часу і чалавечай дабрыні.

Летась у калектыў прыйшлі радасныя весткі. Тэатр моды «Спадчына» Ваўкавыскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі быў удастоены матэрыяльнай падтрымкі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Ала Сурмінава атрымала званне народнага майстра па саломапляценні.



**Вольга СЦЕЛЬМАШОК, выпускніца 8 класа СШ №7 г. Ваўкавыска.**

**ПРА АЎТАРА**

***Наш чарговы аўтар старанна вучыцца. Любіць чытаць, найперш фэнтэзі і дэтэктывы. Дзяўчыне падабаецца працаваць на камп'ютары, пісаць тэксты. Дарэчы, у творчых конкурсах яна ўжо ўдзельнічала неаднойчы. Хобі — пінербол. А яшчэ Вользе даспадобы падарожнічаць з сябрамі — хоць пехатой, хоць на веласіпедах, хоць на школьным аўтобусе.***

***— Але больш за ўсё я люблю танцаваць. Дзевяць гадоў займаюся гэтым ва ўзорным ансамблі «Непоседы» пры раённым Доме культуры, — распавяла 14-гадовы аўтар. Кім хоча стаць у жыццы, дзяўчына пакуль яшчэ не вызначылася.***

# ВУЧЫЛАСЯ ВУЧЫЦЬ НА... ЛЯЛЬКАХ

**Яна жыццярадасная, разумная, актыўная і заразліва аптымістычная. Яна заўсёды ў руху. Яе любяць вучні, паважаюць калегі, ёю захапляюцца наваколькныя. Але галоўнае яе дасягненне — гэта ўменне натхняць (ці, як сёння кажуць, матываваць) сваіх выхаванцаў на мноства карысных спраў. Тацццяна Міхайлаўна Дуброўка — настаўнік ад Бога. А яшчэ, нягледзячы на тое, што шмат часу аддае сваёй прафесіі, яна паэтэса.**

— Мне здаецца, я нарадзілася настаўнікам. Нікім іншым сябе нават не ўяўляла. Гульня ў школу была галоўнай гульнёй у маім дзяцінстве. «Вучыла» ўсіх запар: бацькоў, сяброў, лялек... І не шкадую абсалютна. Настаўнік — гэта я, гэта маё. Гэта тая прафесія, якая выбрала мяне сама. І я шчаслівая. «Знайдзіце сабе прафесію па душы — і вы не будзеце працаваць ні дня ў сваім жыцці», — гэтыя словы мудры Канфуцый сказаў як быццам пра мяне. І як бы цяжка часам ні было, не шкадую і дзякую Усявышняму, што зрабіў мяне настаўніцай.

***— Вы выкладаеце беларускую мову і літаратуру. Чаму выбралі менавіта гэтыя прадметы?***

— Яшчэ з дзяцінства я прывыкла размаўляць на беларускай мове. На ёй размаўлялі мае бацькі, а я брала з іх прыклад, як гэта звычайна робіць маленькія дзеці. Па меры свайго сталення я заўважала, што мае аднагодкі, ды і многія іншыя навокал, пачалі саромецца сваёй роднай мовы. Я лічыла гэта няправільным і вырашыла, што буду спрыяць яе ўкараненню ў першую чаргу сярод маладога пакалення. Я паставіла перад сабой мэту паказаць дзецям, што беларуская мова — вельмі прыгожая і самабытная. А саромецца яе — гэта тое ж самае, што саромецца сваіх каранёў, сваёй Радзімы.

***— Тацццяна Міхайлаўна, акрамя сваёй працы, вы захапляецеся напісаннем вершаў. Што для вас галоўнае ў паэзіі?***

— Я лічу, што паэзія павінна дарыць чалавеку гармонію, служыць прыгажосці, ствараць свет ідэальнага. Таму ў сваіх вершах наўмысна не закранаю сацыяльныя тэмы, штосьці «нізкае» і бруднае. Найперш маляўнічыя вобразы нашай Радзімы спрыяюць нараджэнню радкоў новых вершаў.

***— Як можна апісаць творчы працэс?***

— Мне часта задаюць такое пытанне. Часам усё адбываецца спантанна: нараджаецца ў галаве нейкая цікавая думка, якая мяне чымсьці асабліва прыцягнула і, не пакідаючы мяне ў спакоі, паступова рыфмуецца і ператвараецца ў верш. А бывае так: з'яўляецца радок, які пачынае гучаць ува мне незалежна ад майго жадання. Верціцца ў галаве, пакуль я не сяду, не засяроджуся і не выкладу сусе думкі на паперы. З'яўленне вершаў — гэта заўсёды адчуванне, якое нельга выказаць словамі.

...Настаўніцкая праца — адзін з самых важных і высакародных на зямлі заняткаў. Ад асобы педагога і настаўніка, яго прафесійных і чалавечых якасцяў шмат у чым залежыць лёс і жыццё вучняў, заўтрашні дзень краіны. Напэўна, у кожнага з нас быў, ёсць у жыцці любімы настаўнік, які не толькі дапамог авалодаць ведамі, але і вывеў на дарогу жыцця.

У нашай школе працуюць цудоўныя педагогі, і мне хочацца, каб пра іх даведалася як мага больш людзей.

**Марыя ІЛЬЯНКОВА, выпускніца 10 класа СШ №4 г. Ваўкавыска.**

**ПРА АЎТАРА**

***— Я вельмі люблю спяваць, займаюся вакалам ужо пяць гадоў, удзельнічаю ў школьных і гарадскіх мерапрыемствах, — гаворыць пра сябе аўтар. Марыі — 16 гадоў. У чытанні яна аддае перавагу жанру «фэнтэзі». Яшчэ вельмі любіць падарожнічаць разам з бацькамі на машыне — па Беларусі і не толькі. Дома ў яе ажно тры хатнія гадаванцы-сабакі: адна такса і два «дваранскага» паходжання.***

***Марыя пасля заканчэння школы плануе вывучыцца на журналіста. «Сёння — гэта мая мэта ў жыцці», — кажа дзяўчына. Яна ўжо два гады наведвае ў школе гурток, мае публікацыі ў раённай газеце. У такім конкурсе, як наш, удзельнічае ўпершыню.***

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 26 августа 2014 года повторных торгов по продаже единым комплексом имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

| | | Инв. № кадастровый |
|---|---|---|
| Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе) | Производственный корпус с трансформаторной подстанцией, общая площадь 734,1 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; составные части и принадлежности: производственный корпус готовностью 68% с трансформаторной подстанцией готовностью 49%) | 602/U-49786 |
| | АБК с пристроенными помещениями производственного назначения со скважиной и водонапорной башней, общая площадь 1339,2 кв. м (назначение: здание неустановленного назначения; составные части и принадлежности: АБК готовностью 42%, с пристроенными помещениями производственного назначения готовностью 21%, навесом готовностью 70%, со скважиной готовностью 100% и водонапорной башней готовностью 100%) | 602/U-49784 |
| Сведения о земельных участках | Кадастровый номер 624484800001000234, площадь – 1,9869 га, назначение – строительство экспериментального завода по производству карбита кальция и углекислоты, очистных сооружений; кадастровый номер 624484800001000235, площадь – 0,1555 га, назначение – строительство экспериментального завода по производству карбита кальция и углекислоты, очистных сооружений; | |
| Местонахождение продаваемого имущества | Республика Беларусь, Минская область, Пуховичский р-н, Пережирский с/с, 10 | |
| Сведения о продавце | ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220050, г. Минск | |
| Сведения об организаторе торгов | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск | |
| Начальная цена предмета торгов (с учетом НДС) | 1 949 444 795 белорусских рублей | |
| Сумма задатка | 190 000 000 белорусских рублей | |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель аукциона (покупатель) в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Торги проводятся 26 августа 2014 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 15.08.2014 по 22.08.2014 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.**

**Телефоны для справок:**
**(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»), (017)200-99-78, (029)350-46-23 (ОАО «Минскремстрой»).**

---

25 августа 2014 г. в 12.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна № 1».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестская передвижная механизированная колонна № 1»: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Белорусская, 51.

Время регистрации в день проведения собрания с 11.30 до 12.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 18.08.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200215539 Совет директоров.

---

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## на право заключения договора аренды земельного участка для строительства и обслуживания производственной базы в районе дер. Волма Драчковского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Форма проведения аукциона | Открытый |
| 2 | Дата, время и место проведения аукциона | г. Смолевичи, ул. Советская, 125. Смолевичский райисполком, зал заседаний, 16 сентября 2014 года, в 11.00 |
| 3 | Продавец и его адрес | г. Смолевичи, ул. Советская, 125, Смолевичский райисполком |
| 4 | Земельный участок, его кадастровый номер и адрес | Лот № 1 — площадь 1,7381 га, кадастровый номер 624800000001002450 в районе дер. Волма |
| 5 | Условия продажи | Без изменения целевого назначения |
| 6 | Целевое назначение земельного участка | Лот № 1 — для строительства и обслуживания производственной базы (размещение объектов обрабатывающей промышленности) |
| 7 | Сроки аренды | Лот № 1 — 99 (девяноста девять) лет |
| 8 | Сроки заключения договора аренды | После оплаты стоимости предмета аукциона в течение 2 рабочих дней |
| 9 | Начальная (стартовая) цена продажи | Лот № 1 — 1 331 796 000 рублей |
| 10 | Условия аукциона | А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть индивидуальные предприниматели, юридические лица |
| 11 | Наличие инженерной инфраструктуры | Лот № 1 — электроснабжение, водоснабжение, асфальтированный подъезд |
| 12 | Условия оплаты | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| 13 | Сумма задатка и реквизиты продавца | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области р/с 3600627000007, УНП 600537220, код банка 153001812 ЦБУ 621 филиала 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») |

**Затраты на организацию и проведение аукциона (в том числе изготовление землеустроительного дела, осуществление государственной регистрации создания земельного участка, публикация информационного сообщения) подлежат возмещению победителем аукциона.**

**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемым земельным участком — каждый четверг с 9.00 до 13.00.**

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни по адресу: г. Смолевичи, ул. Подлесная, д. 11, каб. № 8.**

**Окончательный срок приема заявлений — 10 сентября 2014 г. 17.00.**

**Контактный телефон (8-01776) 5-43-55, моб. 80339027121.**

Для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

- заявление на участие в аукционе;
- документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- индивидуальным предпринимателем — копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем индивидуального предпринимателя — нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителям или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;
- представителем иностранного гражданина — легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе индивидуальные предприниматели и юридические лица, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют документ, удостоверяющий личность.

**Неявка участника аукциона на аукцион признается отказом в его участии.**

---

Организатор аукциона – РУП «Институт недвижимости и оценки» **СООБЩАЕТ ОБ ОТМЕНЕ** Продавцом – ОАО «Оптоэлектронные системы» повторного открытого аукциона по продаже здания административно-хозяйственного с инв. № 500/С-10550, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Черняховского, д.1, назначенного на 28.08.2014. Извещение об указанном аукционе было опубликовано в газете «Звязда» 29.07.2014.

УНП 190055182

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторных аукционных торгов по продаже права заключения договора аренды помещений транспортного республиканского унитарного предприятия «Брестское отделение Белорусской железной дороги»

| № лота | 1 |
|---|---|
| Наименование, местонахождение и характеристика объекта | Право заключения договора аренды отдельных помещений общей площадью 87,4 кв.м (характеристика: имеются – естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, водоснабжение и водоотведение, телефонизация) на 1-м этаже здания вокзала (инв. № 100/С-47089) по ул. Кижеватова, 1Б/1 в г. Бресте |
| Балансодержатель | Транспортное республиканское унитарное предприятие «Брестское отделение Белорусской железной дороги» |
| Начальная цена продажи (руб.) | 1 714 110 |
| Сумма задатка (руб.) | 171 400 |
| Срок аренды | 5 лет |
| Ставка арендной платы | 6 856 603 рубля (67,22 базовой арендной величины на момент заключения договора аренды) |
| Условия оплаты | разовый платеж |
| Размер штрафа, руб. | 15 000 000 |
| Условия продажи | для размещения парикмахерской |
| Организатор аукционных торгов | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** |

**ПРИМЕЧАНИЕ:**

Для участия в аукционе юридических или физических лиц, в том числе индивидуальных предпринимателей, прилагаются к заявлению, подаваемому:

1. юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь:
копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
2. юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь:
легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения;
копия платежного поручения либо иного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
3. индивидуальным предпринимателем:
копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя;
копия платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона;
4. физическим лицом – копия платежного документа о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона.

При заключении соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона организатору аукциона предъявляются:

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность.

Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. №1049.

Право заключения договора аренды возникает у победителя аукциона с момента внесения им определенной в ходе аукционных торгов цены за право аренды нежилого помещения. Данная сумма должна быть внесена победителем в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Договор аренды должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

**Победитель аукциона обязан оплатить организатору аукциона в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов** сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.

**Аукцион состоится <u>28 августа 2014 г.</u> в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**
**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 14.07.2014 г. до 17.30 22.08.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**
**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**
**Сайты: www.bgcn.by, www.brest-region.gov.by, www.gki.gov.by**

---

**Считать недействительным** страховой полис филиала СООО «Белкоопстрах» в г. Бресте по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу, формы 2РН2РП серия БМ № 0713219.

УНП 100706519

---

## ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин

**информирует акционеров о том, что выплата дивидендов за 2013 год будет производиться с 1 по 30 сентября 2014 года. Дивиденды на 1 акцию составляют 826,13 руб.**

Выплата будет производиться зачислением на счета в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Жлобин.

Акционерам, приобретавшим акции общества в обмен на ИПЧ «Имущество», зачисление дивидендов производится на лицевые счета в филиалах ОАО «АСБ Беларусбанк» по месту заключения договора на приобретение акций и почтовыми переводами по месту жительства.

Список акционеров на получение дивидендов составляется по данным реестра владельцев ценных бумаг на 1 марта 2014 года.

УНП 400076540 *Дирекция ОАО «БЕЛФА»*

*Партугальскі досвед*

# ТРЫ ПАДЫХОДЫ,
## або Лісабон вачыма будучага архітэктара



**Невялічкая Партугалія, самая заходняя дзяржава Еўропы, падзяляе разам з магутнай Іспаніяй Пірэнейскі паўвостраў. Што яшчэ вядома сярэднестатыстычнаму беларусу пра гэтую краіну? Ну хіба што пра Васка да Гама і мост, як у Сан-Францыска. А студэнтка Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Дар'я Мандзік паехала пераймаць вопыт у Лісабон на цэлы год. За прайшоўшы час у дзяўчыны ўжо назбіралася шмат цікавых уражанняў, якімі яна падзялілася з «Чырвонкай».**

**— Даша, распавядзі, як табе ўдалося трапіць у Партугалію?**

— Наш універсітэт удзельнічае ў праграме па абмене студэнтамі «Erasmus Mundus». Усяго набралі групу з 11 чалавек. Усе мы раскіданы па трох краінах — Іспаніі, Партугаліі і Італіі. Цэлы год я вучуся ў Лісабонскім універсітэце, а пасля мне залічаць гэты час у Беларусі як пройдзены чацвёрты курс. У прынцыпе, архітэктары па ўсім свеце павінны ведаць адны і тыя ж рэчы, таму вялікай розніцы ў праграмах навучання няма. Праўда, не скажу, каб усё было абсалютна аднолькавым…

**Партугальскія выкладчыкі больш скіраваны на рэальны праект — яны ставяцца да працы так, нібыта ты сапраўды збіраешся гэта пабудаваць.**

**— Якія ж адрозненні ў падыходах да выкладання?**

— Усе нашы выкладчыкі — архітэктары-практыкі, дарэчы, даволі заможныя людзі. Яны шмат паказваюць і тлумачаць, у тым ліку і свае праекты, абмяркоўваюць з намі розныя падыходы да вырашэння пэўных праблем. Упэўнена: у беларускіх выкладчыкаў таксама ёсць свае праекты, але часцей за ўсё мы пра іх не ведаем. Магчыма з-за таго, што ў нас аўтарскімі працамі бываюць, як правіла, прыватныя дамы і інтэр'еры, а большасць астатніх будынкаў праектуецца адмысловымі інстытутамі па тыповых праектах. Партугальскія выкладчыкі больш скіраваны на рэальны праект — яны ставяцца да працы так, нібыта ты сапраўды збіраешся гэта пабудаваць.

Яшчэ адно адрозненне ад нашай сістэмы адукацыі: абавязкова хоць нейкая частка праекта павінна быць зроблена ў групе. Гэта дапамагае, бо чуеш крытыку ў свой бок. Праўда, працаваць з партугальцамі складана, але мне падабаецца сама ідэя.

**— Ты ўзгадала пра іншы падыход — якая «фішка» ў партугальцаў?**

— Узімку я была ў Беларусі на абароне праектаў школ. Першае, што кінулася ў вочы,— знешні выгляд будынкаў ніяк не звязаны з тым, што навокал. У Партугаліі нас прывучаюць абавязкова працаваць з акружэннем. Напрыклад, трэба размяшчаць, як павінна выглядаць школа для двухпавярховай старой вуліцы, забудаванай светлымі дамкамі з чырвонымі дахамі. Не кожная архітэктура сюды ўпішацца.

**— Наколькі важнае для партугальцаў захаванне гістарычнай архітэктурнай спадчыны?**

— Гэта іх улюбёная тэма. Але не толькі захаванне, а яшчэ і асваенне. Падчас уладарання дыктатара Салазара (1928 — 1968) рэстаўрацыяй партугальская дзяржава сцвярджала сваю магутнасць. Пасля Салазара ў краіне пачаўся перыяд, калі людзі актыўна будаваліся, кіруючыся дэвізам: «Дзе хочам, там і будуем». Але зараз усё становіцца на свае месцы. На Партугалію вельмі моцна паўплываў эканамічны крызіс апошніх гадоў, таму новае будуюць мала — збольшага гэта рэстаўрацыя і рэканструкцыя. На працягу года менавіта гэтымі рэчамі я і займаюся. Як гэта выглядае? Нам далі рэальную вуліцу ў цэнтры Лісабона, якую муніцыпалітэт хоча рэканструяваць. Вуліца маленькая, вузенькая, дамы закінутыя, але яна мае выгаднае становішча. Мы туды хадзілі, замяралі і апісвалі, размаўлялі з жыхарамі. Пасля першага семестра служачыя муніцыпалітэта прыходзілі на абарону праектаў і знаёміліся з нашымі прапановамі, крытыкавалі, ацэньвалі.

**— Беларусам ёсць чаму павучыцца ў рэканструкцыі?**

— Ты калі-небудзь думала, што можна зрабіць з Гальшанамі? А падыходы, як казаў наш выкладчык, зводзяцца да трох. Можна проста ўзяць аб'ект і аднавіць яго з выкарыстаннем тагачасных тэхналогій, як тое відаць на старажытнай гравюры, у межах канкрэтнай эпохі. Можна проста пакінуць руіны ў тым стане, у якім яны знаходзяцца. Трэці варыянт — спалучыць са старой пабудовай нешта сучаснае, каб сыграць на кантрасце. Такой рэканструкцыі, прычым вельмі якаснай, многа па ўсёй Еўропе, бо засталося шмат старога і з ім трэба нешта рабіць.

**У Партугаліі нас прывучаюць абавязкова працаваць з акружэннем. Напрыклад, трэба разлічыць, як павінна выглядаць школа для двухпавярховай старой вуліцы, забудаванай светлымі дамкамі з чырвонымі дахамі. Не кожная архітэктура сюды ўпішацца.**

Да архітэктараў у Партугаліі ставяцца з павагай, іх меркаванне мае вагу. Гэта не дзіўна, бо два лаўрэаты (за 1992 і 2011 гады) Прыцкераўскай прэміі (аналаг Нобелеўскай, толькі па архітэктуры. — **Аўт.**), паходзяць з гэтай краіны. У Партугаліі вельмі шмат гістарычных помнікаў, але і сучасная архітэктура таксама на высокім узроўні.

**— Адна з праблем Мінска — забудова горада, якая робіцца больш шчыльнай. Ці актуальна гэта для Лісабона?**

— Горад, шчыра кажучы, вялізны: ад гістарычнага цэнтра і старой забудовы да спальных раёнаў даволі далёка. У цэнтры шчыльнай забудовы няма: самі дамкі невысокія, забудова пераважна квартальная, і ўшчыльняць папросту няма куды, бо вуліцы вельмі вузкія. У Мінску іншы тып гарадской забудовы — шматкватэрныя дамы, што стаяць асобна; паміж імі ёсць пустыя месцы, якія па нарматывах павінны займаць дзіцячыя пляцоўкі, паркоўкі, зялёныя зоны і зоны адпачынку.

**— Якія мясціны ў Лісабоне ты прапанавала б паглядзець?**

— Калі чалавек хоча зразумець краіну, раю проста прагуляцца па вуліцах, паразмаўляць з мясцовымі жыхарамі. Але і архітэктуру мясцовую, безумоўна, варта пабачыць — напрыклад, знакаміты манастыр Жыронімуш, які мы бачым штодня, бо жывём побач, альбо мястэчка Сінтра, што непадалёк ад горада. Дзіўна, але цэнтр горада поўніцца закінутымі будынкамі — шмат хто з'язджае.

**— Ведаю, што ты вялікі аматар паходаў. Ці ўдалося табе павандраваць па Партугаліі?**

— Пакуль пра сапраўдныя паходы толькі мару. Аднак у нас была вандроўка з групай па справах рэканструкцыі ў невялікае мястэчка Іданья-а-Велья. Муніцыпалітэт арганізаваў нам паездку, каб студэнты прапанавалі рашэнні некалькіх праблем у мястэчку.

**Нам далі рэальную вуліцу ў цэнтры Лісабона, якую муніцыпалітэт хоча рэканструяваць. Пасля першага семестра служачыя муніцыпалітэта прыходзілі на абарону праектаў і знаёміліся з нашымі прапановамі, крытыкавалі, ацэньвалі.**

**— Напэўна, вы навучыліся спяваць партугальскія песні і танцаваць пад іх?**

— Песні ў Партугаліі сапраўды вельмі прыгожыя — яны называюцца «фаду». Іх спявалі жонкі маракоў, якія заставаліся на беразе чакаць сваіх мужоў. Фаду — гэта брэнд: іх можна пачуць паўсюдна, але мне не надта падабаецца, калі некаторыя рэчы становяцца заманкамі для турыстаў.

Часам заходзім у адзін квартал, дзе гучыць добрая музыка (напрыклад, бразільская), і можна патанцаваць. Што да кулінарыі — традыцыйныя стравы на смак не вельмі адрозніваюцца ад тых, што мы прывыклі есці ў Беларусі. Хіба што тут спажываюць больш рыбы і морапрадуктаў.

**— Навучанне, наколькі я разумею, вядзецца на партугальскай мове?**

— На партугальскай і англійскай, а ў паўсядзённым ужытку мы карыстаемся рускай і беларускай мовамі. Зараз палова выкладчыкаў размаўляе з намі на сваёй роднай мове, але яе мы яшчэ добра не вывучылі. Агульныя фразы ведаем — у краму схадзіць можам. Партугальская мова не надта складаная — агульную думку зразумееш. А яшчэ яны гавораць, як нам падаецца, вельмі доўга, а пасля высвятляецца, што сказалі толькі пра нешта адно.

**— Акрамя гаманлівасці, ці ёсць яшчэ адметныя рысы менталітэту?**

— Партугальцы нікуды не спяшаюцца. Кідаецца ў вочы, што калі яны нешта робяць — то зусім не мітусяцца. У параўнанні з энергічнай Барселонай, дзе мне таксама давялося пабываць, гэта асабліва заўважна,— яны павольныя, упэўненыя ў сабе.

**— Дык і беларусы ж не надта хуткія…**

— Так, але мы заўжды нервуемся з-за гэтага. Сядзіш і думаеш: маўляў, я нічога не зрабіў, такі-сякі. А партугальцы пачуваюцца добра. Адпачыў, захацеў — яшчэ адпачыў, а пасля можна і папрацаваць… Усё як мае быць.

**— А як яны ставяцца да беларусаў?**

— Збольшага ўсе партугальцы ведаюць пра нашу краіну. Калі чуюць «Беларусь», палова ківае: «Мінск, Мінск». Цікава, адкуль ім знаёмы Мінск? Можа, дзякуючы футболу? Тут усе «страцілі галаву» ад футбола. Ледзь не забылася: у Партугаліі яшчэ ведаюць пра канструктывізм, бо ў заходняй праграме яго вывучаюць разам з астатнімі плынямі мадэрнізму. Так што на адной з лекцый па гісторыі сучаснай архітэктуры мы вучылі прафесара правільна вымаўляць імёны Малевіча, Лісіцкага і Леанідава. Было вельмі прыемна.

**— Сумуеш па радзіме?**

— Вельмі. Калі знаходзішся ў іншай краіне, не хапае сяброў і сям'і. Затое з'явілася разуменне: ад'язджаць з Беларусі не хачу. А набрацца партугальскага вопыту ў галіне архітэктуры — гэта можна!

**Кацярына РАДЗЮК.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении аукционных торгов по продаже земельных участков в г. Бресте в частную собственность граждан Республики Беларусь

| № лота | Адрес участка/ кадастровый номер | Кадастровый № 14010000000 | Общая площадь (га) | Целевое назначение использования участка | Начальная цена предмета аукциона (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Расходы по подг. земел.-кадастр. док. (руб.) | Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | пер. 6-й Лыщицкий, 10 | 1026881 | 0,1047 | Строительство и обслуживание жилого дома | **76 249 345** | 15 240 000 | - | ограничений в использовании земель нет |
| 2 | пр-д Березовский, 7/1 | 1028041 | 0,1002 | | **97 296 204** | 19 450 000 | **450 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 3 | район Ковельского шоссе, 86 | 1004609 | 0,1101 | | **104 293 436** | 20 850 000 | **450 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 4 | ул. Берестовая, 24 | 1022210 | 0,1017 | | **71 648 260** | 14 320 000 | **450 000** | ограничений в использовании земель нет |
| 5* | ул. Красногвардейская, 36 | 1027451 | 0,1185 | | **241 760 737** | 48 350 000 | **2 834 194** | 0,0058 га – охранная зона воздушной линии электропередачи напряжением 0,4 кВ |

*** – повторные аукционные торги**

**Организатор аукционных торгов – КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»**

**Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462,** и состоится при наличии не менее двух участников. В аукционе могут участвовать граждане Республики Беларусь.

**Перечень документов, представляемый участником аукциона**: заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков**); гражданином** – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность. При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе**, **обязано** подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Порядок осмотра объекта осуществляется участником аукциона по согласованию с организатором торгов.

**Задаток в размере до 20% от начальной цены предмета аукциона (лота) перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на р/с № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Бреста, код 246, УНП 290433924**.

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан:**

• в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов, осуществить оплату за предмет аукциона, возместить расходы, понесенные городским бюджетом по подготовке земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка, а также компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников). Оплата цены продажи предмета аукциона может быть осуществлена в рассрочку, в соответствии с решением Брестского горисполкома от 15 мая 2008 г. № 881;

• в течение 2 месяцев со дня получения выписки из решения горисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона обратиться за государственной регистрацией права частной собственности на земельный участок;

• приступить к освоению земельного участка в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство).

**Аукцион состоится 18 сентября 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 14.08.2014 г. до 17.30 12.09.2014 г. (перерыв с 13.00 до 14.00; вых.: суб., вс.) по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50.**

**Контактные телефоны: 53 81 92, 53 45 65.**

**Сайты: www.bgcn.by, www.city.brest.by и www.gki.gov.by**

SEX-БАЛЯСЫ

# ЛЕТНІЯ ІНСТЫНКТЫ

**...У яе былі доўгія, чорныя як смоль, шаўкавістыя дагледжаныя валасы. Крыху раскосыя вочы і выступаючыя скулы, прамая грыўка на лбе надавалі вобразу нейкі азіяцкі шарм. Загарэлая, даўганогая, ды яшчэ на высокай танкетцы, са стыльнай сумачкай і навушнікамі ад мабільнага тэлефона... Яна зайшла ў паўпусты вагон метро і села якраз насупраць мяне. Хаця звычайна дзяўчаты ў такіх кароткіх спадніцах у транспарце не садзяцца, а едуць стоячы... Вы памятаеце, чым уласна стаў знакаміты фільм «Асноўны інстынкт» з Шэран Стоўн? Не кожны прыгадае змест стужкі, але, безумоўна, у памяці застаўся эпізод у паліцэйскім участку, калі галоўная гераіня падчас допыту перакідвае нагу цераз нагу. Усё доўжыцца лічаныя імгненні, якія назаўсёды сталі класікай жанру.... Перада мной жа пачалося «шырокафарматнае кіно» працягласцю ў палову шляху ў метрапалітэне...**



Фота Яраслава ЛЫСКАЎЦА.

Адставіўшы сумачку ўбок (якую ў такой сітуацыі дзяўчаты ў кароткіх спадніцах абавязкова кладуць сабе на калені), мая «візаві» пачала спакойна і дзелавіта настройваць сабе мелодыі ў навушніках. Адзін прыпынак, другі... Я ўжо неяк пісаў, што, калі чалавек свядома хоча нешта агаліць, ён павінен быць гатовы да таго, што нехта на гэта будзе глядзець. Па-мойму, цалкам справядліва. Пагадзіцеся, чаму я працяглы час павінен ехаць, матаючы галавой злева направа, да столі і назад? Я люблю глядзець прама. Нарэшце, заўважыўшы, мабыць, рэакцыю іншых пасажыраў, дзяўчына робіць нейкую няўклюдную спробу ці то ногі шчыльней звесці, ці то спадніцу рукамі зверху прыцiснуць. Гэтая спроба нагадвае анекдот. У атэлі здарыўся пажар. З усіх нумароў даносяцца крыкі: «Вады! Вады! Вады!» Тут адчыняецца адно з вокнаў. У ім з'яўляецца задаволены мужчына і таксама крычыць: «А ў 506-ы нумар — шампанскага!».

Нарэшце дзяўчына рашуча ўзнялася да выхаду. *«Она прошла, как каравелла по зелёным волнам, прохладным ливнем после жаркого дня. Я оглянулся посмотреть, не оглянулась ли она, чтоб посмотреть, не оглянулся ли я...»* За ўвесь час паездкі на твары дзяўчыны не здрыгануўся ні адзін мускул. На ім чыталася: маўляў, надакучылі вы ўсе, спёка ж! А можа, ёй музыкай нешта навеяла? Прыгажуня проста абцягнула ўніз спадніцу і выйшла...

Ведаеце, асабіста ў мяне ёсць некалькі дакладных спосабаў вызначыць, калі ж, нарэшце, пачалося сапраўднае лета. Па-першае, як ужо зазначыў вышэй, калі вагоны метро становяцца паўпустымі: заходзь, сядай, дзе хочаш. Па-другое, калі перад гэтым вы ў інтэрнэце, у «жоўтых» газетах паспелі пабачыць большасць вядомых «зорак» шоу-бізнесу, вядучых (прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва, вядома), якія выклалі свае фотаздымкі ў купальніках (пры гэтым вы, у прыватнасці, павінны адзначыць, што бюст Ганны Семяновіч павялічыўся яшчэ як мінімум на палову памеру). Прычым фатаграфій, зробленых уласнаручна. Гэта зараз трэнд такі новы. Папарацы супраць Валачковай — ужо маветон. Дарэчы, магчыма, па гэтай прычыне мы сёлета пра яе нічога не чулі? Ці я штосьці прапусціў? А так, сама зняла — сама выклала.

Але галоўны спосаб вызначэння таго, што прыйшло спякотнае лета, як вы, напэўна, ужо здагадаліся, — гэта тое, як мы пачынаем апранацца. Памятаеце жарт каманды КВЗ «Адэскія мэны"? Адэсіты падчас заняткаў сексам не здымаюць шарсцяныя шкарпэткі. Чаму? Аргазм, гэта, вядома, добра, але ж і насмарк нікому не патрэбны. Гэта я да таго, што плаўкіца цэлы — плаўкіца і мазгі. Хочацца, каб найперш было зручна і камфортна нам самім. Меркаванне пра цябе з боку навакольных неяк адыходзіць убок само сабой. Сёлета спёка пабіла ўсе тэмпературныя рэкорды, таму ад намёкаў на лёгкую эротыку ў адзенні яшчэ некалькі тыдняў таму мы неяк адразу пераскочылі да... Зноў жа, як у анекдоце. На пляжы. «Малады чалавек, дык вы ж узбудзіліся!» — «Жанчына, гэта я не вам!»... Неяк трэба было зайсці да суседзяў. Тыя папрасілі некалькі хвілін — каб апрануцца. Гэта як у жарце, памятаеце (хаця якія там жарты!)? У спёку вельмі прыемна хадзіць па кватэры без нічога. Адна нязручнасць — калі табе пазванілі ў дзверы...

Ці трэба зараз некага за нешта асуджаць?.. Спрэчнае пытанне. Вось еду ў ліфце з калегам па цэху. Той з буфета вязе ў свой кабінет марозіва. Пазірае на яго і кажа: «У спёку салодкае нельга... Але ж вельмі хочацца!» А мы ўсе ведаем, што калі нельга, але вельмі хочацца, тады можна! У гэты час вельмі хочацца да вады. І асвяжыцца, і фігуру прадэманстраваць. Праўда, пра яе трэба было клапаціцца загадзя. Ну, хаця б як у тым жарце. Хітраватая дзяўчына пачала рыхтавацца да купальнага сезона яшчэ з зімы: пакрысе адкормлівала сваю сяброўку. Жанчыны змагаюцца самі з сабой, выбіраючы паміж гігіенай і максімальнай адкрытасцю. Дарэчы, памятаеце анекдот, як мужчына выбіраў для жонкі купальнік? Зайшоў у краму, глядзіць на тавар — суцэльныя «нітачкі». Нарэшце кажа прадаўцу: «Дайце, калі ласка, вось гэтую мадэль. На ёй хаця б нейкі кавалачак тканіны прысутнічае». — «Мужчына, гэта бірка!» Бываюць гарачым летам і іншыя сітуацыі. Сужэнец збіраецца ехаць адзін на курорт, пакуе чамаданы. Раптам жонка заўважае, як той цішком здымае заручальны пярсцёнак. «Гэта яшчэ навошта?» — «А ты ведаеш, як там спякотна?»

Летам нам хочацца халодных напояў і гарачага сексу на пяску дзікага пляжа. Хаця мы цудоўна ведаем, што і тое, і другое можа нанесці шкоду арганізму. Ведаем. Але хочам! Ведаеце, чаму? Таму што гэтымі ўспамінамі нам потым жыць цэлы год! Так што трымайцеся, сябры, і спрабуйце радавацца жыццю! Лета ж!

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Я МОГ СТАЦЬ ІНЖЫНЕРАМ...»



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Пэўнага шуму на прасторы інтэрнэту нарабіў ваш удзел у польскім шоу талентаў «Голас»...***

— Шчыра сказаць, я паехаў у Польшчу на фестываль баяністаў, дзе даваў майстар-клас і распавядаў пра свой інструмент у Варшаве. А там у інтэрнэце ўбачыў, што якраз праходзіць кастынг на «Голас» і падумаў: а чаму б і не паспрабаваць сябе? На кастынгу мне далі «дабро», а потым даслалі спіс песень, з якіх трэба было выбраць адну для выканання на шоу. Я выбраў кампазіцыю польскага гурта «Piersi» і выканаў яе на беларускай мове. Маю ідэю ўхвалілі, хаця я баяўся ім такі ход прапаноўваць: маглі сказаць «не фармат». Аднак там цэняць патрыятызм і індывідуальнасць.

***— Але адмовілі вам, як потым пісалі, менавіта на падставе таго, што вы «не фармат»...***

— Ёсць фармат тэлебачання і шоу. А я не падышоў з улікам фармату тэлебачання. Яны чакалі, што я змагу праспяваць нешта фірменнае, а тут хлопец з баянам і спявае па-беларуску! Потым я зрабіў ім сюрпрыз і праспяваў Адэль «Rolling in the deep», але было ўжо позна. Мне сказалі, што калі б я пачаў з яе, то меў бы шанц. Нягледзячы на тое, што далей за адбор я не прайшоў, потым мяне запрасілі выступіць на фінальным шоу.

**Яны чакалі, што я змагу праспяваць нешта фірменнае, а тут хлопец з баянам і спявае па-беларуску! Потым я зрабіў ім сюрпрыз і праспяваў Адэль «Rolling in the deep», але было ўжо позна.**

***— Ці з'явіліся нейкія новыя знаёмыя?***

— Атрымаў шмат прапаноў. Там я пазнаёміўся з гуртом «Piersi», які вельмі папулярны ў Польшчы: гэтыя музыканты ведаюць, як прасоўваць музыку на рынку. Я размаўляў з іх менеджарам, і зараз мы разглядаем магчымасць зрабіць сумесны запіс.

***— Вы вучыцеся ў кансерваторыі і пры гэтым актыўна рэалізуеце сябе як эстрадны выканаўца. Класічная школа не перашкаджае?***

— У мяне быў перыяд, калі я займаўся толькі класікай, ездзіў на многія конкурсы. Потым зацікавіўся джазам. Паралельна паспеў нават оперным вакалам пазаймацца, аднак зразумеў, што гэта наогул не маё. Паступіўшы ў кансерваторыю, дасягнуў той кропкі, калі трэба было вызначыцца: буду я працягваць займацца класічнай музыкай ці ўсё ж эстраднай. Хоць мне абодва варыянты былі даспадобы, выбраў эстраду. Я перакананы, што няма нічога лепшага за класічную музыку, яна вечная, але па адчуваннях мне больш імпануе іншы кірунак. Я адчуваю жаданне зрабіць уклад менавіта ў эстрадную музыку. І калі вызначыўся з гэтым, то пайшоў у «Акадэмію талентаў».

***— Складана далося такое рашэнне?***

— Я не думаў пра гэта. Проста паспрабаваў — і атрымалася. Па жыцці, калі я бяруся за нешта, то буду ўсе сокі з сябе выціскаць. Некалі я вучыўся ў гімназіі з фізіка-матэматычным ухілам і паралельна займаўся музыкай. Перамагла музыка.

***— А захапленне музыкай неяк уплывала на вашу папулярнасць у школе?***

— Як толькі бачылі ў руках баян, то адразу ў публікі знікала жаданне слухаць. А я неверагодна палюбіў гэты інструмент і не мог зразумець, чаму так яго ўспрымаюць. І цяпер даказваю, што баян немагчыма не любіць. На постсавецкай прасторы яго ўспрымаюць часцей за ўсё як інструмент, на якім іграюць польку на вяселлі. А ў Еўропе да баяна стаўленне зусім іншае. Яму толькі сто гадоў, а ён папулярны ва ўсім свеце. На ім іграюць сербы, палякі, амерыканцы, італьянцы. У Аўстраліі нават ёсць ціхаакіянскі кубак па баяне.

Баян — гэта душа. Некалі я выбраў менавіта гэты інструмент, таму што мне падабалася яго гучанне. Захацелася ім валодаць лепш, чым мая сястра. У выніку сястра спыніла заняткі, а я працягваю і сёння.

***— Колькі зараз у вас інструментаў?***

— Два інструменты стаяць дома і яшчэ шэсць у бацькоў у Баранавічах. Усе з'явіліся ў розны час. Некаторыя мне дарылі. На нейкіх я пачынаў іграць, таму яны захоўваюцца як гісторыя. А калі хто захоча пачуць фартэпіяна, то і на ім магу сыграць. Яшчэ ёсць гітара, на якой вучуся іграць самастойна, радаваць дзяўчат.

***— Але ж у спадарожніцах жыцця хочацца бачыць дзяўчыну, якая будзе любіць у вас перш за ўсё чалавека, а ўжо потым музыканта. Ці памыляюся?***

— Самае цікавае, што дзяўчатам бывае зусім не важна, на якім інструменце грае хлопец, галоўнае — каб быў музыкантам. Нават не ведаю, што іх прыцягвае. Я, калі знаёмлюся з дзяўчынай, не хачу расказваць ёй, чым займаюся. Няхай для яе гэта потым стане «прыемным бонусам». Хочацца нармальнага знаёмства двух звычайных людзей.

***— Каханне натхняе творчых людзей. Ці часта вы бываеце ў стане закаханасці?***

— Я аднолюб, але захапляюся прыгажосцю. Калі бачу прыгожую дзяўчыну, то магу падысці і сказаць ёй пра гэта. Альбо магу кветку падарыць (робіць папяровую ружу і дорыць мне. — **Аўт.**). Мяне натхняе прыгажосць ва ўсім. Шмат падарожнічаю і ў вандроўках таксама знаходжу натхненне.

***— Адна з вашых галоўных мэт — стаць вялікім музыкантам. Акрамя гэтага, да чаго яшчэ імкняцеся ў жыцці?***

— Каб стаць ім, можа ўсё жыццё спатрэбіцца. Яшчэ хацелася б стварыць моцную сям'ю. Каб вяртацца дадому, дзе цябе чакае каханая і дзеці. У гэтым увесь сэнс.

**Алена ДРАПКО.**



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар-галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: першы намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА, рэдактар аддзела Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 19.878.
Нумар падпісаны ў 19.30 13.08.2014 г.

# ТОНКАЯ РУХОМАЯ МЯЖА...



Фота Надзеі БУЖАН

**Літаратура ўсё ў меншай ступені застаецца сталай прафесіяй, пазбаўленай налёту дылетантызму. І, відаць, не толькі таму, што за публікацыю мастацкіх твораў ужо не плацяць ранейшыя «савецкія» ганарары. Адна з прычын і ў тым, наколькі зробленае пісьменнікам становіцца запатрабаваным. Калі меркаваць па невялікіх тыражах літаратурна-мастацкай перыёдыкі, з запатрабаванасцю якраз і бяда... І тым не менш ёсць людзі, якія любяць сваю справу, якія рупяцца над тым, каб і ў друк выбраць лепшае, і літаратурны працэс адлюстраваць напоўніцу. Адзін з такіх асяродкаў — невялікі калектыў рэдакцыі часопіса «Полымя». Дарэчы, не так даўно ў гэтага выдання — новы галоўны рэдактар. Алесь Мікалаевіч БАДАК. З ім і прапануем увазе чытачоў гутарку пра «Полымя» і сучасную беларускую літаратуру.**

**— Алесь Мікалаевіч, «Полымя» мае сваю «вагу», яно — стары і сталы часопіс... А сённяшні час патрабуе нечага новага... Вядома ж, размова не пра новае дзеля новага... І ўсё ж такі — традыцыйная цікаўнасць з улікам, што толькі-толькі ў часопісе пачаў працаваць новы галоўны рэдактар... Якія адкрыцці зробіць той, хто працягне ці пачне чытаць сёлета «Полымя»?**

— Вы абсалютна правільна заўважылі, што менавіта час патрабуе нечага новага. Хто б ні стаў сёння галоўным рэдактарам, ён павінен прыносіць з сабой новыя ідэі. Не сакрэт, змяншэнне чытацкай увагі да мастацкай літаратуры, у першую чаргу, ударыла па літаратурнай перыёдыцы. Выдавецтвы хутка пераарыентаваліся. Яны больш выдаюць кніжак забаўляльнага характару, у якіх традыцыйна шырокі чытач, і ўвогуле, сталі шматпрофільнымі: на адных калідорах рыхтуюцца да друку і класіка, і жаночыя раманы, і даведачная літаратура, і белетрызаваныя біяграфіі сучаснікаў, чые імёны сёння на слыху. Калі б заўтра масавы чытач стаў цікавіцца антычнай філасофіяй, можна не сумнявацца, выдавецтвы тут жа пачалі б выдаваць Геракліта, Платона ці Арыстоцеля. Вядома, такая ўнутраная палітыка дапамагае ім выжываць. Але для літаратурнай перыёдыкі гэта не выйсце. Глыбока памыляецца той, хто лічыць, што калі б часопісы рэгулярна друкавалі... нават не бульварную, а, скажам так, літаратуру самых масавых жанраў — дэтэктывы, фантастыку, то гэта зрабіла б іх самаакупнымі. Калі так, то тады рынак даўно павінны былі запаланіць дзясяткі перыядычных выданняў, дзе друкавалася б толькі падобнае чытво. Аднак гэтага не здарылася! У нашых кіёсках прадаецца шмат розных «Лиз», «Ксюш», адрасаваных жанчынам, дзе можна прачытаць і новыя плёткі пра «зорак», і пра тое, як прыгатаваць яечню альбо выйсці замуж за мільярдэра. Але там не друкуюцца жаночыя раманы ці няхай сабе апавяданні!

**Чым больш у крытыцы — сапраўднай, мудрай, шчырай, арыгінальнай — зацікаўлена сама літаратура, рэдакцыі, выдавецтвы, тым вышэйшы яе ўзровень.**

Мне запомніўся артыкул галоўнага рэдактара часопіса «Знамя» Сяргея Чупрыніна, змешчаны ў студзеньскім нумары гэтага выдання. Артыкул — спроба асэнсаваць, чаму часопіс, які ў 1990 годзе меў мільённы тыраж, сёння з цяжкасцю збірае 4 тысячы. Хто вінаваты і, галоўнае, што рабіць далей? Зразумела, тут праблема не толькі «Знамени». Прычым, калі гаварыць пра некалі вельмі папулярныя расійскія тоўстыя часопісы, то «Знамя» знаходзіцца не ў самай горшай сітуацыі. Больш за тое, гэта праблема агульналітаратурная, у які бок ні павярніся: ці на Захад, ці на Усход. Дык вось: што рабіць? Сяргей Чупрынін глыбока перакананы, што пры ўсім драматызме цяперашняй сітуацыі тоўстыя літаратурныя часопісы павінны заставацца ў сваёй нішы і друкаваць некамерцыйную літаратуру, тое, што патрабуе ад чытача душэўнай працы і вымагае ад яго пэўнай гуманітарнай падрыхтоўкі. І з гэтым цяжка не пагадзіцца. Іншая справа, што мяжа паміж камерцыйнай і некамерцыйнай літаратурай вельмі тонкая і, больш за тое, вельмі рухомая. «Дзікае паляванне караля Стаха» — гэта камерцыйная літаратура? Так. Але гэта і класіка нашага айчыннага прыгожага пісьменства. А па-другое, сёння ўсё ж самы галоўны вораг нашых часопісаў — гэта шэрасць, другаснасць, банальшчына. З імі трэба змагацца, калі мы сапраўды не хочам, каб заўтра колькасць нашых чытачоў вымяралася ўжо не тысячамі і сотнямі, а дзясяткамі.

